

АСЦЯРОЖНА, ДЗВЕРЫ ЗАЧЫНЯЮЦЦА... 5



ОФІСНЫ БОЛЬ. ШТО РАБІЦЬ? 6

15 МАЯ 2019 г.
СЕРАДА
№ 88 (28955)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА

# БЕЗ ЛІШНІХ ВЫДАТКАЎ

## Аляксандр Лукашэнка даручыў пабудаваць Нацыянальны выставачны цэнтр да 2021 года

**«Такі выставачны цэнтр у краіне — у любой краіне — патрэбны. У сучасным свеце немагчыма без арганізацыі выставак і падобных мерапрыемстваў весці перш за ўсё гандаль, а для экспартна арыентаванай краіны наогул немагчыма развіццё», — адзначыў кіраўнік дзяржавы на прысвечанай гэтай тэме нарадзе.**

Паводле яго слоў, ідэя абмяркоўвалася даўно, была пастаўлена задача аб прапрацоўцы пытанняў развіцця выставачнай дзейнасці і будаўніцтва свайго Нацыянальнага комплексу, які б адпавядаў усім сучасным патрабаванням.

«Але пытанне неапраўдана зацягнулася, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Таму на такім высокім узроўні давайце вызначацца і давайце зробім так, каб ужо ў 2021 годзе мы мелі падобны цэнтр».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што для актыўнай і абавязкова эфектыўнай работы па арганізацыі выставачнай дзейнасці ў краіне неабходна падумаць аб стварэнні адзінай сістэмы і адзінага цэнтра выставачнай дзейнасці.

«Прымаюцца ўсе прапановы, рашэнні трэба прымаць у гэтым паўгоддзі па другім пытанні, ды і па першым трэба вызначацца і пачынаць будаўніцтва гэтага цэнтра. Адзінае патрабаванне: цэнтр не павінен быць палацавым, гэта павінен быць функцыянальны цэнтр з усімі будынкамі і памяшканнямі для правядзення падобных мерапрыемстваў», — адзначыў беларускі лідар.

Што датычыцца кошту выставачнага комплексу, Прэзідэнт заклікаў не мудрагеліць на карысць таннасці. Паводле яго слоў, цэнтр павінен быць прыгожым знешне, але гэта не значыць, што за сімпатычную «абгортку» і нефункцыянальную архітэктуру трэба плаціць шалёныя грошы. «Трэба зрабіць проста і прыгожа, дыхтоўна, якасна», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў нас ёсць вопыт будаўніцтва якасных і недарагіх аб'ектаў. «Яшчэ раз папярэджваю: лішніх трат быць не павінна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### ❍ У ТЭМУ

### Выставачны комплекс плануецца пабудаваць у раёне «Экспабела»

Падрабязнасцямі аб будаўніцтве Нацыянальнага выставачнага цэнтра па выніках нарады падзяліўся **першы намеснік кіраўніка ўрада Аляксандр ТУРЧЫН.**

На думку першага віцэ-прэм'ера, прынятае рашэнне аб будаўніцтве з'яўляецца вельмі важным, паколькі Беларусь — экспартна арыентаваная краіна, пабудова такога комплексу разглядаецца праз гэтую прызму.

«Колькасць выставак, удзел у іх замежных кампаній, замежных партнёраў, і як вынік — прасоўванне нашых тавараў за мяжу, — растлумачыў Аляксандр Турчын. — На самай справе, я б сказаў, што гэта нацыянальны праект — будаўніцтва такога цэнтра. Безумоўна, у многіх краінах ёсць спецыялізаваныя выставачныя цэнтры, арыентаваныя менавіта на правядзенне выставак, якія ў тым ліку дэманструюць патэнцыял гэтых краін. Рашэнне прынята, папярэдні архітэктурны праект мы сёння паказвалі кіраўніку дзяржавы».

Першы віцэ-прэм'ер дадаў, што ў прынцыпе ў Прэзідэнта пярэчанняў не было, аднак ён яшчэ раз даручыў прапрацаваць праект з улікам эканоміі грашовых сродкаў. «Усё павінна быць годна, прыгожа, але нядорага», — рэзюмаваў Аляксандр Турчын.

Такім чынам, пастаўлена задача — у 2021 годзе Нацыянальны выставачны цэнтр павінен функцыянаваць.

«Месца размяшчэння — у раёне «Экспабела», — сказаў ён і растлумачыў, што гэта пляцоўка з левага боку ад гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Былі і іншыя прапановы, напрыклад, пляцоўка ў раёне вёскі Малінаўка Мінскага раёна на скрыжаванні МКАД і Брэсцкай шашы, аднак кіраўнік дзяржавы адхіліў такую прапанову, паколькі на прапанаваным месцы знаходзяцца жылыя дамы. Аляксандр Лукашэнка чарговы раз падкрэсліў: неабходна ўлічваць інтарэсы людзей.

«Чаму спатрэбілася пабудаваць асобны выставачны цэнтр, нягледзячы на наяўнасць двух спецыялізаваных збудаванняў і пляцовак тыпу Футбольнага манежа?» — пацікавіліся журналісты.

«У нас са спецыялізаваных выставачных пляцовак сёння ў краіне існуе два аб'екты — гэта павільён «БелЭкспа» на Пераможцаў, 14 — «Рамонак» так званы, і пабудаваны новы цэнтр у Кітайска-беларускім парку, — адзначыў Аляксандр Турчын. — А Футбольны манеж, «Мінск-Арэна» будаваліся для зусім іншых мэт. Многія выстаўкі там з аб'ектыўных прычын не могуць размяшчацца — па габарытах не праходзяць і гэтак далей». СТАР. 2

# СЯМЕЙНАЯ КРЫНІЦА



Мазырскія жыхары Канстанцін і Валянціна ШУРМЕЛІ пабраліся шлюбам трыццаць адзін год таму. Яны часта прыязджаюць на радзіму Валянціны ў вёску Нагорная, бо там, побач з паселішчам, прыпяцкі бераг — сапраўдны цуд Палесся. А яшчэ — крыніцы, у якіх самая смачная ў свеце вада. Крынічнае месца «Добрыца» знаходзіцца за дзвесце метраў ад дома-лецішча Шурмеляў. Там я і ўбачыў сужэнцаў — пасля работы на вясновым агародзе, яны прыйшлі ў гэты цяністы куток.

— У нашым сямейным жыцці гэтая крыніца з'яўляецца своеасаблівым абярэгам і, як правіла, калі наведваем вёску, ідзём сюды — набраць вады, навесці парадак, пасядзець у халадку, бо тут утульна і спакойна, — дзеляцца сваімі пачуццямі Валянціна і Кастусь. — Пабыць на крыніцы — быццам бы дакрануцца да нечага сакральнага.

Летась высілкамі Козенскага сельскага Савета крыніца набыла новы выгляд: колодзежнае кальцо накрылі дахам, зрабілі сцёк, паставілі лаўкі, вакол крыніцы паклалі бут. Цяпер прыходзяць і бяруць крынічную ваду не толькі свае — вясковыя жыхары, а і мазыране таксама. А Шурмелі, як найстарэйшыя па-ўзросце і самыя блізкія жыхары да гэтага гаючага вытоку сталі своеасаблівымі захавальнікамі «Добрыцы».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.** *Мазырскі раён.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**
*«Мы плануем, што з улікам сродкаў з розных крыніц, а таксама зробленых на рэспубліканскім суботніку, каля Br12 млн будзе выдаткавана на падрыхтоўку базы стацыянарных лагераў. Іх у гэтым сезоне будзе працаваць больш за 140. Нам удалося спыніць тэндэнцыю масавага закрыцця стацыянарных лагераў. Шырока ўжываецца вопыт выкарыстання закрытых малакамплектных школ у экалагічна чыстых рэгіёнах, дзе ёсць уся інфраструктура. Рэспубліканскаму цэнтру на правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі выдзелена больш за Br47 млн, з якіх Br1,3 млн — на набыццё пуцёвак для льготных катэгорый дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, больш за Br500 тысяч — на падрыхтоўку».*

# САМАЯ ВАЖНАЯ «ЯЧЭЙКА»

## Дзяржава думае над тым, як удасканаліць дапамогу сем'ям

**Міжнародны дзень сям'і быў зацверджаны Генеральнай Асамблеяй ААН невыпадкова. У пачатку 90-х ва ўсім свеце рэзка вырасла колькасць разводаў, павялічыўся працэнт людзей, якія дасягнулі 30-гадовага ўзросту і так ні разу і не ўступілі ў шлюб. Да таго ж, сучасныя людзі часта хочуць пазбегнуць лішніх абавязацельстваў, таму жывуць без афіцыйнай рэгістрацыі адносін. А большасць сучасных сем'яў нараджаюць дзяцей досыць позна і абыходзяцца пры гэтым адным дзіцем, а то і зусім не хочуць іх мець наогул. Усё гэта — прыкметы крызісу сям'і, а значыць, і крызісу ўсяго грамадства.**

Гэтыя сусветныя тэндэнцыі характэрныя і для нашай краіны. Таму асабліва актуальнай і важнай з'яўляецца правільная палітыка дзяржавы ў адносінах да «ячэйкі грамадства».

Што ж яно прапануе і над чым працуе, каб удасканаліць дапамогу сям'і?

### Дадатковыя гарантыі шматдзетным

У першую чаргу спецыялісты адзначаюць 3-гадовы аплачваемы адпачынак па доглядзе дзіцяці — унікальную меру, якой няма ў большасці нават самых багатых краін. Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на сёння прызначана больш чым на 300 тысяч дзяцей. Акрамя таго, дзяржава выплачвае сем'ям 11 відаў дапамог, якімі ахоплены 505 тысяч дзяцей.

З'яўленне дзіцяці ў сям'і — дадатковая фінансавая нагрузка на бацькоў, таму сем'ям пры яго нараджэнні выплачваецца аднаразовая дапамога. Пры нараджэнні першынца яна складае 10 бюджэтаў пражытковага мінімуму (1 БПМ роўны 224 руб.), пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ.

З 2015 года дзейнічае праграма доўгатэрміновай падтрымкі шматдзетных сем'яў — сямейны капітал у памеры 10 тысяч долараў, пры нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей. Згаданая праграма завяршаецца 31 снежня 2019 года, але ўжо прынята рашэнне аб яе падаўжэнні яшчэ на пяць гадоў.

Пакуль што права распараджэння сродкамі сямейнага капіталу з'яўляецца пасля дасягнення дзіцем 18 гадоў. Выкарыстоўваць іх можна на паляпшэнне жыллёвых умоў, на паслугі ў сферы адукацыі, медыцыны, сацыяльнага абслугоўвання, а таксама на назапашвальную пенсію для маці. Датэрмінова сямейны капітал можна выкарыстоўваць на атрыманне некаторых платных медыцынскіх паслуг. СТАР. 2

Армія

# КРЫЛАТЫЯ АБАРОНЦЫ

## Штурмавік, знішчальнік, вучэбны трэнажор і зброя

**Звяно з чатырох штурмавікоў Як-130 дапоўніла на выхадных авіяцыйную эскадрыллю з 12 крылатых машын 116-й штурмавой авіяцыйнай базы ў Лідзе. Першыя вучэбна-баявыя самалёты тут атрымалі яшчэ чатыры гады таму. За гэты час тэхнікі і лётчыкі дасканала асвоілі ўнікальныя магчымасці машыны, якая ва ўмелых руках можа быць як карысным памочнікам, так і небяспечнай зброяй. А якія піруэты здольны рабіць у небе што сапраўдны самалёт, што яго сімулятар... гэта трэба ўбачыць. Што і паспяшаліся зрабіць карэспандэнты «Звязды».**



**Міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ агледзеў новыя штурмавікі і пацікавіўся службай на авіябазе.**

Фота Андрэя САЗОНАВА.

### Хто ў самалёце гаспадар

Авіяцыйная тэхніка савецкага парка старэе, і падтрымліваць яе ў баяздольным стане ўсё больш складана, таму ў межах канцэпцыі будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2020 года і былі закуплены шматфункцыянальныя самалёты Як-130, зазначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ:**

— Як трэніровачны сродак ён дазваляе рыхтаваць лётчыкаў, прычым і на тыя машыны, што плануюцца да закупкі, — Су-30СМ. А як баявая машына — здольны ўзняць на сабе да трох тон баявой нагрузкі. Наш цяперашні штурмавік Су-25 бярэ з сабою да чатырох тон узбраення. А па іншых характарыстыках, у тым ліку спектр узбраення і эфектыўнасці дзеяння ў баі, Як-130 — практычна аналаг Су-25. СТАР. 3

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай абваліў амерыканскія біржы

Амерыканскія фондавыя індэксы абваліліся на фоне ўзмацнення супрацьстаяння ЗША і Кітая ў межах гандлёвай вайны, сведчаць даныя біржаў. Рэзкі спад адбыўся пасля таго, як Пекін абвясціў аб увядзенні з 1 чэрвеня ў адказ увазных пошлін у дачыненні да больш чым пяці тысяч тавараў, якія паступаюць з ЗША. Так, індэкс Dow Jones на Нью-Ёркскай фондавай біржы ўпаў на 695,21 пункта (2,68 працэнта) і склаў 25247,16 пункта. Індэкс S & P, які ўключае 500 найбуйнейшых амерыканскіх кампаній, страціў 79,87 пункта (2,77 працэнта) і апынуўся на адзнацы 2801,53 пункта. Індэкс электроннай біржы NASDAQ упаў на 247,36 пункта (3,12 працэнта), апусціўшыся да 7669,58 пункта. Як адзначае The Wall Street Journal, на фоне супярэчнасцяў ЗША і Кітая рэзка вырас (на 28 працэнтаў) індэкс валацільнасці VIX, які таксама называюць «індэксам страху». Ён павялічваецца, калі на біржах назіраецца падзенне, і яго найбуйнейшы з кастрычніка рост з'яўляецца негатыўным знакам для інвестараў. Больш за ўсё ад гандлёвых войнаў на гэты момант пакутуюць тэхналагічныя кампаніі. Значныя страты нясуць і аўтавытворцы. Напрыклад, акцыі Tesla ўпалі за дзень на 5,22 працэнта.

### Саудаўская Аравія заявіла аб дыверсіі на сваіх нафтавых танкерах

У тэрытарыяльных водах Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ) паблізу порта Фуджэйра былі атакаваныя чатыры замежныя судны. Гэтую інфармацыю пацвердзілі ў МЗС ААЭ. Арабскі тэлеканал «Аль-Арабія» паведаміў, што караблі пацярпелі «з-за ўзаемадзеяння з невядомым прадметам». Ні пацярпелых, ні ўцечкі небяспечных вадкасцяў у выніку інцыдэнту не адбылося. Тым не менш тое, што адбылося, атрымала шырокі міжнародны рэзананс. Міністр энергетыкі, прамысловасці і мінеральных рэсурсаў Саудаўскай Аравіі Халед аль-Фалех заявіў, што два з чатырох пацярпелых суднаў — нафтавыя танкеры каралеўства, і яны «сталі мэтай сабатажу». «Адно з двух суднаў рухалася для пагрузкі на яго нафты ў порце Рас-Таннура, адкуль павінна было быць накіравана ў Злучаныя Штаты кліентам Saudi Aramco», — удакладніў ён, дадаўшы, што канструкцыі абодвух суднаў нанесены істотны ўрон. Пазней стала вядома, што іншыя два пацярпелыя судны належаць самім ААЭ і Нарвегіі.

ISSN 1990 - 763X
19088>
9 771990 763008

### Адкрыўся 72-і Канскі кінафестываль



У конкурснай праграме сёлетняга Канскага кінафестывалю будуць прадстаўлены адразу чатыры фільмы, знятыя рэжысёрамі-жанчынамі. Пры гэтым адзначаецца, што за ўсю гісторыю кінафоруму толькі адной кінематаграфістцы — Джэйн Кэмпіён — удалося атрымаць галоўны прыз «Залатую пальмавую галінку». Старшыня журы 72-га Канскага кінафестывалю — мексіканскі рэжысёр Алехандра Гансалес Іньярыту. Журы праграмы «Асаблівы погляд» узначальвае ліванская актрыса і рэжысёр Надзін Лабакі. Кінафестываль адкрые фільм «Мёртвыя не паміраюць» Джыма Джармуша. У конкурсную праграму таксама ўвайшоў фільм Квенціна Таранціна «Аднойчы ў Галівудзе» з Леанарда Дзі Капрыа, Брэдам Пітам і Марго Робі. Адзін з кандыдатаў на «Залатую пальмавую галінку» — фільм іспанскага рэжысёра Педра Альмадовара «Боль і слава», які расказвае пра кінематаграфістаў, што старэюць. У галоўных ролях — Антоніа Бандэрас і Пенелопа Крус. Сусветна вядомаму французскаму акцёру Алену Дэлону ў Канах будзе ўручана ганаровая «Залатая пальмавая галінка» за яго выдатную кар'еру ў кінематографе. 72-і Канскі кінафестываль пройдзе да 25 мая.

### КОРАТКА

- Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей упэўнены ў падпісанні візавага пагаднення Беларусі з ЕС да падаражэння шэнгенскіх віз.
- **Новая аперацыйная ў Гомельскай аблбальніцы дазволіць удвая павялічыць колькасць аперацый на пазваночніку.**
- Шырокая грашовая маса ў Беларусі за красавік зменшылася на 3,2 %.



- **Беларусь вядзе перагаворы аб арганізацыі прамых авіярэйсаў з Мінска ў Амерыку і Індыю.**
- У Беларусі створаны экспертны савет па пытаннях цэн і тарыфаў.




# Вада пачынае смяротны адлік

## Як без рызыкі адпачыць каля рэк і азёр?

**Сёлетняя вясна ўжо паспела адзначыцца магутным летнім акордам, калі тэмпература паветра некалькі дзён сягала за плюс 25 градусаў. Пацяпленне наступіла рэзка, і некаторыя адпачывальнікі ўжо накіраваліся тады да вадаёмаў. Але паколькі спякота грымнула раптоўна, то вада нармальна за такі кароткі час прагрэцца не здолела. І як вынік, падчас купання ўжо танулі людзі.**

— Усе ахвяры знаходзіліся ў нецвярозым стане, — кажа **вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Напрыклад, 20 красавіка ў тэхнічным вадаёме ў Калодзішчах, што пад Мінскам, падчас купання патануў 47-гадовы мужчына. Дзве іншыя трагедыі разыгрываліся па падобным сцэнарыі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Смяротны «градус»

Для таго каб чалавек мог знаходзіцца ў вадзе без рызыкі атрымаць пераахаладжэнне, яна павінна прагрэцца мінімум да 18 градусаў. Ды і тэмпература паветра мусіць быць не ніжэй за 22—23 цяпла. Калі ж разбежка паміж гэтымі двума паказчыкамі істотная, то такі кантраст можа прывесці да звужэння сасудаў галаўнога мозга і агульнага парушэння работы ўнутраных органаў. А гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да рызыкі лятальнага зыходу. СТАР. 3

# БЕЗ ЛІШНІХ ВЫДАТКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён падкрэсліў: Нацыянальны выставачны цэнтр — гэта іміджавы і знакавы праект для нашай краіны, ён стане чарговым упрыгожаннем не толькі сталіцы, але і ўсёй Беларусі.

Якія крыніцы фінансавання? Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, гэта альбо крэдытныя рэсурсы Банка развіцця, альбо ўключэнне ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму. Пры гэтым на нарадзе беларускі лідар падкрэсліў: у далейшым згаданы цэнтр павінен быць самаакупным, гэта значыць, усе эксплуатацыйныя выдаткі будзе несці арганізацыя, якая эксплуатуе будынак.

У тым праекце, які на нарадзе прадэманстравалі кіраўніку дзяржавы, запланавана наступная плошча цэнтра: 15 тысяч квадратных метраў выставачных плошчаў і 15 тысяч квадратных метраў — кангрэс-хол і бізнес-цэнтр. Сумарна — 30 тысяч квадратных метраў. Таксама прадугледжана адкрытая пляцоўка для выстаўкі цяжкай тэхнікі. Аднак Аляксандр Турчын падкрэсліў: гэта толькі папярэдняя плошча.

Ён адзначыў, што калі выстаўкі не праходзяць, у цэнтры будзе адбывацца пастаянны рух і будуць арганізаваны іншыя мерапрыемствы. Між тым заўважыў, што ў Беларусі за мінулы год прайшло больш за 200 выставак. Гэта значыць, каляндар дастаткова насычаны.

Што датычыцца адзінай сістэмы каардынацыі выставачнай дзейнасці, то вядома, што за каардынацыю выставак за межамі Беларусі адказвае Беларуская гандлёва-прамысловая палата, а ўнутры краіны адзінага аператара няма. Урад атрымаў даручэнне: да заканчэння першага паўгоддзя разгледзець розныя варыянты па адзінай сістэме і ўнесці на разгляд кіраўніку дзяржавы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# На варце вяршэнства Канстытуцыі

**Прэзідэнт Беларусі прывёў да прысягі суддзю Канстытуцыйнага Суда Алу БОДАК. Цырымонія адбылася ў Палацы Незалежнасці. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў юрыста з заняццем пасады і ўручыў службовае пасведчанне і падарункавы экзэмпляр Канстытуцыі. Прэзідэнт падкрэсліў, што подпіс у акце аб прынясенні прысягі — бадай што самы важны ў жыцці.**

«Не кожнаму даецца права і магчымасць быць членам найвышэйшага суда ў нашай краіне — Канстытуцыйнага. Жадаю творчых поспехаў, бо лічу Канстытуцыйны Суд і творчай лабараторыяй нашых вядучых юрыстаў. Чакаю ад вас канкрэтных прапаноў па ўдасканаленні Канстытуцыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт высока ацаніў паслужны спіс Алы Бодак: пачаўшы з шараговай пасады, яна прафесійна вырасла да намесніка міністра юстыцыі. Але, лічыць кіраўнік дзяржавы, галоўны вопыт юрыст набыла ў парламенце, дзе была старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

На думку Алы Бодак, аднымі з галоўных падыходаў да змяненняў у Канстытуцыі з'яўляюцца ўмацаванне суверэнітэту і дзяржаўнасці Беларусі, стварэнне для ўсіх трох галін улады неабходных умоў для далейшага ўдасканалення і вырашэння задач па паступовым устойлівым развіцці краіны.

«Канстытуцыя і надалей будзе ставіць у аснову інтарэсы простага чалавека», — выказала ўпэўненасць суддзя.

На цырымоніі прыняцця прысягі прысутнічалі старшыні Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыні Канстытуцыйнага і Вярхоўнага Судоў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# САМАЯ ВАЖНАЯ «ЯЧЭЙКА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На сённяшні дзень ідзе работа над тым, каб пашырыць кірункі, па якіх сямейны капітал можа быць «размарожаны» датэрмінова. Адзін з найбольш верагодных такіх кірункаў — будаўніцтва жылля, заяўляе **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ**.

А **намеснік старшыні пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Людміла КАНАНОВІЧ** анансавала, што ў найбліжэйшай будучыні дзяржава абяцае дадатковыя гарантыі шматдзетным маці ў галіне пенсійнага забеспячэння, а таксама адраснай падтрымкі. У прыватнасці, шматдзетным мамам, якія выхоўваюць чацвярых дзяцей, дэкрэтны адпачынак могуць пачаць уключаць у агульны працоўны стаж для налічэння пенсіі ў поўным аб'ёме.

Акрамя таго, сёння маці, якія нарадзілі і выхоўваюць 9 і больш дзяцей, маюць права на пенсію «За асаблівыя заслугі перад рэспублікай». Спецыялісты і дэпутаты прапануюць знізіць планку колькасці дзяцей у гэтым выпадку да сямі, а то і да пяці. Гэта прапануецца дзеля павышэння ўзроўню сацыяльнай абароны шматдзетных маці і павышэння прэстыжу мацярынства, растлумачыла Людміла Канановіч.

## Бацькі — не толькі тыя, што нарадзілі

Да святкавання Дня сям'і могуць з поўным правам далучыцца і больш за 10 тысяч замяшчальных сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў.

Як адзначае **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА**, летась страцілі апеку родных 2,3 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак, пры гэтым біялагічнымі сіротамі сталі толькі 11 % дзяцей з гэтай колькасці. Тым не менш спецыяліст заяўляе, што колькасць дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у нашай краіне штогод зніжаецца — і гэта добрая тэндэнцыя.

## Тры дадатковыя ўмовы

**Прадстаўнік Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі Вольга АТРОШЧАНКА** адзначае, што ў беларускіх сем'ях прасочваецца няроўнае размеркаванне хатніх абавязкаў паміж мужчынам і жанчынай. Таму вельмі важна ўцягненне беларускіх мужчын у адказнае бацькоўства ды пашырэнне і дадатковае заахвочванне такой ініцыятывы, калі ў адпачынак па доглядзе дзіцяці сыходзіць бацька.

Акрамя таго, Прадстаўнік Фонду ААН у галіне народанасельніцтва адзначае важнасць рэалізацыі мер, накіраваных на пашырэнне бясплатных або даступных па цане паслуг па доглядзе дзяцей. І трэцяя ўмова — гэта наяўнасць дружалюбных да бацькоў рабочых месцаў. Калі арганізацыі і прадпрыемствы будуць даваць гарантыі і льготы бацькам — гэта адкрые больш магчымасцяў для працаўладкавання і наступнай паспяховай работы, большага заробку для жанчын-маці. А мужчынам гэта дасць магчымасць часцей праводзіць з дзецьмі час і быць больш залучанымі ў жыццё сям'і. Таму дзяржава, на думку Вольгі Атрошчанкі, павінна заахвочваць стварэнне ў арганізацыях рабочых месцаў, дружалюбных да бацькоў.

**Святлана БУСЬКО.**

### Беларуская сям'я ў лічбах

У Беларусі сёння налічваецца больш за 2,7 млн сем'яў, з іх у 1,2 млн ёсць непаўналетнія дзеці.

У 2018 годзе ў нашай краіне было заключана 60 714 сямейных саюзаў.

Рашэнне аб уступленні ў шлюб беларусы з кожным годам прымаюць усё ў больш сталым узросце. Так, летась сярэдні ўзрост уступлення ў першы шлюб у жанчын склаў 26 гадоў, у мужчын — 28,1 года.

У 2018 годзе сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні дзіцяці ў краіне склаў 29,4 года, у гарадской мясцовасці — 29,8 года, у сельскай мясцовасці — 28,2 года.

Ва ўзросце 60 і больш гадоў летась было заключана 739 шлюбаў (у 2010 годзе — 576 шлюбаў).

Па выніках мінулага года, на тысячу беларускіх шлюбаў прыпадае 546 разводаў.

# У МІНСКУ АДКРЫЎСЯ АПЕРАТЫЎНА-КААРДЫНАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

Яго магчымасці прадэманстравалі прэм'ер-міністру, старшыні рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў Сяргею РУМАСУ

**Галоўная задача цэнтра — каардынаваць дзеянні пры планавым развіцці падзей, а таксама выпрацоўваць меры рэагавання на няштатныя сітуацыі падчас правядзення II Еўрапейскіх гульняў (за выключэннем інцыдэнтаў, якія адносяцца да кампетэнцыі сілавога блока). З 19 чэрвеня да 2 ліпеня ён будзе працаваць у кругласутачным рэжыме, у складзе адной змены задзейнічаюць каля 100 чалавек. Пры стварэнні аператыўна-каардынацыйнага цэнтра ўлічылі міжнародны вопыт і прапановы Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў.**

Інфармацыя аб няштатных сітуацыях падчас Гульняў адразу будзе трапляць у гэты цэнтр. Пытанні, якія ён будзе вырашаць, ужо цяпер, да старту спаборніцтваў, адпрацоўваюцца на трэніроўках. Адну з іх паказалі кіраўніку ўрада ў аператыўнай зале. Такая трэніроўка штатнага персаналу — прыклад таго, як будзе прымаць рашэнні рабочая змена ў выпадку інцыдэнтаў падчас Гульняў. У аператыўнай зале будуць знаходзіцца адказныя за розныя кірункі — пратакол, арганізацыю харчавання, транспартных зносін, тэлетрансляцыі, работу валанцёраў, узаемадзеянне з Еўрапейскімі алімпійскімі камітэтамі і іншыя. Тут жа размешчаны перагаворныя пакоі для аператыўнага вырашэння няштатных сітуацый.

Сяргею Румасу таксама прадэманстравалі работу Цэнтра тэхнічных аперацый, які ў складзе АКЦ адказвае за рэагаванне на ўсе тэхнічныя інцыдэнты падчас Еўрапейскіх гульняў. Спецыяльнае падраздзяленне будзе займацца кантролем усіх інфармацыйных сістэм, якія абслугоўваюць розныя падрадчыкі — «Белтэлекам» і іншыя аператары сувязі. Па выніках кожнага дня будуць збіраць статыстыку тэхнічных праблем, каб ліквідаваць «вузкія» месцы і папярэдзіць паўтор няштатных сітуацый.

Магчымым інцыдэнтам будуць прысвойваць тры ўзроўні — «чырвоны», «жоўты» або «зялёны» ў залежнасці ад ступені іх сур'ёзнасці. Як растлумачыў **дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН**, максімальную колькасць інцыдэнтаў неабходна перакладаць на «зялёны» ўзровень і вырашаць праблемныя пытанні на саміх аб'ектах, бо нізавое звяно кіравання арганізацыяй Еўрапейскіх гульняў — гэта каардынацыйныя цэнтры непасрэдна на кожным з аб'ектаў спаборніцтваў. Для адпрацоўкі дзеянняў АКЦ ва ўмовах, максімальна набліжаных да маштабнага мультыспартыўнага форуму, Сяргей Румас прапанаваў да старту спаборніцтваў правесці комплекснае тэсціраванне ўсіх аб'ектаў Еўрапейскіх гульняў. Зрабіць гэта плануецца ў першай дэкадзе чэрвеня. Асобныя аб'екты Гульняў ужо апрабаваныя ў рэжыме тэставых спаборніцтваў.

Акрамя таго, Сяргей Румас пацікавіўся ступенню гатоўнасці інфармацыйных сістэм для арганізатараў спаборніцтваў, а таксама мабільнай праграмай для гасцей і турыстаў. Для II Еўрапейскіх гульняў было распрацавана адмысловае праграмнае забеспячэнне, якое ў далейшым можа быць выкарыстана на іншых буйных мерапрыемствах, не абавязкова спартыўных. Кіраўнік урада пагадзіўся з тым, што гэты прадукт потым можна камерцыялізаваць. Адна з прапаноў дзяржорганаў — стварыць спартыўную дырэкцыю, якая б дапамагала ў арганізацыі мерапрыемстваў, у тым ліку і за мяжой, з выкарыстаннем распрацаванага праграмнага забеспячэння. Прэм'ер-міністр прапанаваў комплексна прадумаць розныя варыянты ўжо пасля заканчэння Еўрапейскіх гульняў. Ключавая ўмова — такая дырэкцыя, калі яна будзе створана, павінна паўнавартасна функцыянаваць і зарабляць сродкі, а не існаваць на грошы з бюджэту.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Інвестыцыі ў адукацыю

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ — ДЛЯ ЎСІХ

## Сельскія школы атрымаюць фінансавыя ўліванні

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА і кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Аляксандр КРЭМЕР падпісалі пагадненне аб дадатковым фінансаванні праекта «Мадэрнізацыя сістэмы адукацыі Беларусі» ў памеры 90 мільёнаў еўра.**

Праект рэалізуецца ў нашай краіне з 2015 года. За гэты час быў выкананы капітальны рамонт у 40 установах агульнай сярэдняй адукацыі, пастаўлена вучэбнае абсталяванне для 24 кабінетаў хіміі і 11 кабінетаў фізікі.

Пры падтрымцы Сусветнага банка ў 2018 годзе Беларусь упершыню ў сваёй гісторыі прыняла ўдзел у Міжнароднай праграме PISA па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў: даследаваннем было ахоплена больш за 5,8 тысячы 15-гадовых падлеткаў. Яго вынікі стануць вядомыя напрыканцы 2019 года. Дадатковае фінансаванне дазволіць нашай краіне прыняць удзел у даследаванні PISA ў 2021 і 2024 гадах.

З сумы, выдзеленай у рамках новага пагаднення, больш за 81 млн еўра будзе накіравана на мадэрнізацыю школ у вёсках і невялікіх гарадах, каб каля 65 тысяч школьнікаў змаглі навучацца ў адрамантаваных школах з сучасным лабараторным абсталяваннем. Новае пагадненне дазволіць ажыццявіць капітальны рамонт у 220 установах агульнай сярэдняй адукацыі, абнавіць навучальнае абсталяванне ў 262 вучэбных кабінетах. Акрамя таго, у сельскіх школах Віцебскай вобласці (па адной у кожным раёне) будуць створаны цэнтры па аказанні сацыяльна-культурных і псіхалагічных кансультацыйных паслуг. У Магілёўскай вобласці таксама выберуць па адной школе ў кожным раёне, дзе арганізуюць цэнтры інавацыйнага навучання, якія будуць садзейнічаць развіццю прыродазнаўча-навуковай адукацыі.

Яшчэ 6,7 млн еўра накіруюць на мадэрнізацыю сістэмы кіравання адукацыяй. Зараз ствараецца інфармацыйная сістэма кіравання агульнай сярэдняй адукацыяй. Мяркуецца, што далей яна распаўсюдзіцца на ўсе ўзроўні сістэмы адукацыі, што дасць магчымасць ажыццяўляць маніторынг працаўладкавання выпускнікоў ВНУ, іх далейшай кар'еры, вызначаць эфектыўнасць розных адукацыйных праграм.

Падпісанне новага пагаднення прайшло ў сімвалічным месцы — на базе Стараюркавіцкага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад—сярэдняя школа Любанскага раёна. Тут з кастрычніка 2016 года да чэрвеня 2017-га быў праведзены рамонт, у тым ліку за кошт сродкаў Сусветнага банка. Банк выдзеліў Br423 тыс., якія пайшлі на капрамонт даху, памяшканняў другога паверха, санвузлоў і фае. Усе астатнія памяшканні — кабінеты і калідоры першага паверха, харчблок, спартзала з раздзявальнямі — былі мадэрнізаваныя за сродкі раённага бюджэту (Br263 тыс.).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

**о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище, дер. Жажелка и дер. Трубенок Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2. | Дата, время и место проведения аукциона | **14 июня 2019 года, в 10.00**<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3<br>Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3. | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет,<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000057 в дер. Глинище<br>**Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1331 га с кадастровым номером 624881714601000091 в дер. Трубенок |
| 5. | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6. | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7. | Начальная цена продажи | **Лот № 1** – 7 000,00 рублей<br>**Лот № 2** – 7 000,00 рублей<br>**Лот № 3** – 10 000,00 рублей |
| 8. | Условия проведения аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь<br>В) наличие не менее двух участников<br>Г) без права предоставления рассрочки |
| 9. | Наличие инженерной инфраструктуры | **Лот № 1 (в населенном пункте имеется газоснабжение, водоснабжение)**<br>**Лот № 3 (газоснабжение, электроснабжение)** |
| 10. | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49-AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк»<br>г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12. | Начало подачи заявлений | **15 мая 2019 года** с 8.00 до 17.00, каб. № 4 |
| 13. | Окончательный срок приема заявлений | **12 июня 2019 года до 17.00** |
| 14. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | внесения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и внесения платы за земельный участок;<br>осуществления победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>занятия (освоения) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него |
| 15. | Контактные телефоны | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: Лот № 1 – 1668,92 рубля; Лот № 2 – 1602,12 рубля и Лот № 3 – 2208,92 рубля (затраты без учета стоимости информационного сообщения).**

**Затраты на строительство, в том числе на проектирование объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении** 11 июня 2019 года открытого повторного аукциона **по продаже имущества** со снижением начальной цены на 60 % **в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона — 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1)** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3)** Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **ПРИМЕЧАНИЕ:** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лотов № 1, 2, 4, 7:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000016** общей площадью **7,3619 га (право постоянного пользования, доля в праве 299/500). Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-3118**, общей площадью **5 343,6 кв. м,** назначение – здание главного корпуса базы, наименование — **здание главного корпуса базы. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Капитальное строение с инв. № 310/С-53543**, общей площадью **156,5 кв. м,** назначение – здание специализированное энергетики, наименование — **котельная. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая,4/17. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 14.11.2018 г. № 219 (28835)** | **483 388,00** | 24 168,40 | 48 338,80 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 310/D-1736**, общей площадью **1 298,6 кв. м,** назначение – помещение административно-бытового корпуса, наименование — **помещение административно-бытового корпуса. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, пом. 1. Бордюр (инв. № 00000082); покрытие из железобетонных плит (инв. № 00400068). Отопительный котел «Мир 95» (инв. № 11-1) | **110 848,00** | 5 542,40 | 11 084,80 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-2990**, общей площадью **5 928,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **материальные склады. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 00000097) участок 2; ограждение из железобетона (инв. № 0002004) | **305 564,00** | 15 278,20 | 30 556,40 |
| 7 | **Грузовой седельный тягач MAZ 54322**, кузов (рама) № Б/Н, год выпуска не определен, рег. № AE 9263-3 (инв. № 0005007). **Полуприцеп бортовой MAZ 9758002010**, кузов (рама) № Y3M97580090011574, 2009 года выпуска, рег. № А 3213А-3, инв. № 50023 | **3 200,00** | 160,00 | 320,00 |
| **Местонахождение лотов № 14, 21, 22:** г. Добруш, пер. Крылова, 4 | | | | |
| 14 | **Автобус ПАЗ 32053**, инв. № 1-762, рег. № АВ 2384-3 | **3 520,00** | 176,00 | 352,00 |
| 21 | **Экскаватор ЕК-18-20**, инв. № 10124, рег. № ЕВ-3 4346 | **31 760,00** | 1 588,00 | 3 176,00 |
| 22 | **Кран козловой № 1**, инв. № 273, 1970 г.в. | **1 920,00** | 96,00 | 192,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчётный счёт **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 мая 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 7 июня 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст. 127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.11.2018 г. № 219 (28835). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов –** www.gomeloblreklama.by**, раздел «Аукционы» и** www.bankrot.gov.by**. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона по продаже объектов ОАО «Белорусский цементный завод»**

**Лот № 1** Вагонетка автоклавная ВП-1, 1570х2960х280 мм, 1990 г. в., в количестве 8 штук, находящихся по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. 1-го Мая, 70. Начальная цена продажи – 2620,80 рубля, в т. ч. НДС – 436,80 рубля.

**Лот № 2** Поддоны 56 смф-1199,02 со стойками 1600х3190х100 мм, 2004 г. в., в количестве 25 штук, находящихся по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. 1-го Мая, 70. Начальная цена продажи – 7680,00 рубля, в т. ч. НДС – 1 280,00 рубля.

Аукцион состоится **14.06.2019 в 14.00** по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, д. 70, актовый зал.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 13.06.2019 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников — 14.06.2019 с 13.00 до 14.00 по месту проведения аукциона.

Продавец: ОАО «Белорусский цементный завод», г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117.

Организатор аукциона: ООО «БелИнвестОценка», г. Минск, ул. Казинца, 62, пом. 910.

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь, Указом Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 (с изменениями и дополнениями) и Порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов. Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

*Задаток – 10 % от начальной цены продажи лота — перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с Открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи с 9.00 до 17.00. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8 (029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: унитарное предприятие «Строительно-монтажное управление «ПОДЪЕМ» (УНП 192522108) в лице ликвидатора Региса Алексея Альбертовича, +375 29 378-83-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **17 июня 2019 г**. с 9.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Погрузчик ДЗ-133 на базе трактора МТЗ 82.1, 2002 г. в. | 10 152,00 |
| 2 | Автогидроподъемник АГП-30 (на базе КАМАЗ53215), 2005 г. в. | 30 360,00 |
| 3 | Грузовой седельный тягач МАЗ-544008-060-031, 2008 г. в. | 11 364,00 |
| 4 | Полуприцеп бортовой МАЗ 975800, 2010 г. в. | 10 176,00 |
| 5 | Автокран 45717-КС дв.740,31-240-2295530 ш. 52244067, 2005 г. в. | 35 520,00 |
| 6 | Грузовой специальный самосвал МАЗ 555102-223, 2005 г. в. | 7 608,00 |
| 7 | Прицеп тракторный 2ПТС 4,5 т | 432,00 |

Местонахождение – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-04. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

**Май (і неяк раптам?) выбухнуў лістотай! Яшчэ ўчора, здаецца, яе не было, а сёння...**

**Сёння — дождж, можна сказаць, знянацку, бо сіноптыкі аб ім ні словам, ні паўсловам — народ без парасонаў... І куды? Ну вядома ж, пад дрэвы.**

**Схаваліся: за каўняры не лье, падымаюць галовы, каб убачыць чаму. А там...**

**Май выбухнуў лістотай.**

## Дыпламатыя

Пятніца, надвячорак, трамвай. На адным з пярэдніх сядзенняў — маладзіца з дзіцем. Тое міла шчабеча: расказвае, што было ў садку, чым іх сёння кармілі...

— А давай мы татку пазвонім, — «аціаніўшы» стравы, прапануе матуля. — Я яго набяру, а ты скажы, каб ён бліноў нам спёк.

— Дык ты яму сама пра гэта скажы, — не згаджаецца дзіця.

— Не, мне нельга, — уздыхае матуля. — Калі я скажу, мы яшчэ пасварымся, а калі ты — дадому прыедзем, а там — бліны.

## З вёскі...

Парадокс: станцыя метро называецца «Плошча Леніна», а даехаў, на эскалатары падняўся наверх і апынуўся на плошчы Незалежнасці.

Вакзал там паблізу, два ўніверсітэты, так што людзей — самых розных — на прыпынках шмат... Ды галубоў не падманеш: яны злятаюцца да сямейкі, якая перакусвае булкамі, пачынаюць «наразаць кругі» — чакаць пачастунку, хоць гэта і марна: дарослыя захапіліся размовай і птушак не бачаць, сынок (гадоў трохчатырох) дзяліцца з імі нават не думае. Хутчэй наадварот — грозна тупае на птушак нагой, потым — узмахвае рукамі, а ўрэшце яшчэ і крычыць:

— Кыш! Кыш, каб вы падохлі!

...Не іначай у вёску з'ездзіў, з бабуляй грады пасадзіў, курэй паганяў.

## Было і ёсць

Анекдот (а можа, і праўда?..): у школе выпускнікі сустракаліся — праз дваццаць гадоў. Некага пазнавалі, некага — не... «Усе пастарэлі, — прызнаў самы смелы, — адзін я не змяніўся!»

Што, вядома ж, бывае — і з мужчынамі, і жанчынамі.

Максіма, напрыклад, «сто гадоў» не бачыла, а выглядае, — ну акурат як той выпускнік... Пытаюся, як жыве, як яго хлопчык (тады ён у школу ці хадзіў?)...

— Ды нармальна, — кажа. — Яму... 27.

## Свет — клінам

У дзіцячы садок гэты хлопчык хадзіў ахвотна, бо там была Ніка — яго першая і найлепшая сяброўка. Ён нават ажаніцца з ёю збіраўся, калі быў малы. А потым трохі падрос і, вядома ж, паразумнеў, сказаў неяк:

— А ты ведаеш, мама, я не буду з Нікай жаніцца.

— Чаму?

— Ну, гэта ж няправільна: я зусім не ведаю іншых жанчын.

Цяпер таму хлопчыку ўжо за 20. Адвучыўся, адслужыў у войску, працуе. Сустракаецца з сімпатычнай дзяўчынай, і гэта, як выглядае, у іх сур'ёзна: то-бок на адной — як спявала некалі П'еха — *«сошелся клином белый свет...»*.

Што цікава, песня, як быццам, даўно састарэла і амаль не гучыць. А вось свет...

Ён змяніўся і не змяніўся: ва ўсякім разе не страціў — і дасць бог не страціць! — сваёй уласцівасці «сыходзіцца клінам» на некім адным.

## Наш чалавек!

Хабар у асабліва дробных памерах — слоічак маслячкоў: марынаваных, светленькіх, невялічкіх...

Пакуль адкрывалі яго ды частаваліся (не без таго — «ганяючы» грыбкі па талерцы), добра нарагаталіся, бо ўспомнілі расказ калегі пра дзеда, якому ўнучка, запрасіўшы ў госці, строга загадала есці толькі відэльцам — па-гарадскому... Той паспрабаваў. І ў яго, ну вядома ж, атрымалася — з усімі іншымі стравамі, а вось з маслячкамі — не. Яны, каварныя, «уцякалі» ад відэльца, саслізгвалі з талеркі: спачатку — на стол, са стала — на падлогу.

Дзед, як быццам, і там працягваў «паляваў» на іх з відэльцам, пакуль нарэшце не заганяў, не заціскаў у кут і ўжо там не наколваў!

...Госць пра гэта, відаць, сам расказваў і сам жа з сябе смяяўся. Бо яно ж і праўда: на бяседзе няма лепшай прыправы, чым голад. І лепшай аздобы, чым смех.

## Певень каню не таварыш?

Адміністратаркай у гатэлі Наталка працавала даўно і замежнікаў прымала... мала. Напэўна, таму асобныя з іх помняцца да сёння.

Адзін грэк, расказвала, нядрэнна размаўляў па-руску, вельмі любіў розныя прыказкі (хоць толкам іх і не ведаў), а таму перайначваў, як толькі мог. Казаў, напрыклад: «О-о, вы лічыце, што ў нас, у Грэцыі, усё ёсць, што мы катаемся, як сыр за пазухай...»

Наталка яго папраўляла: «Як сыр у масле», ці «...у Хрыста за пазухай». Але грэк на гэта не зважаў: ён гаварыў далей, бо якая розніца, калі (даслоўна) «жыццё пражыць — не мора перайсці». «Пераплыць!» — смяялася Наталка...

Андрэевіч — не грэк, аднак прыказкі «ўжывае» амаль таксама. Ну вось надоечы ён — невысочанькі, паўнаваты (мякка кажучы...) — у сваю вясковую краму прыйшоў: што-нішто купіць збіраўся. Каля касы стаяў, калі прадавец адпускаў аднавяскоўцу хлеб, малако, цыгарэты, потым — кілю пячэння.

— Не замнога будзе? — здзівіўся крамнік. — Яно ж лёгкае.

— Не, давайце... Я з'ем, — паабяцаў хлопец.

— Але ж глядзі — мучное, салодкае... Можа, не захапляўся б, — раіў прадавец, — а то ж распаўнееш... Вунь, як Андрэевіч.

— Ну і няхай, — згадзіўся хлопец. — Добры гаспадар свайго каня заўжды пад навесам трымае.

Андрэевіч, пачуўшы гэта, аж нос задраў, бо ён (тут не падкапаешся) і праўда гаспадар!

...Хацеў пра гэта іншым сказаць — тымі ж словамі і, галоўнае, амаль тут жа (новыя людзі ў краме з'явіліся), і не змог, бо ўсё пераблытаў. Сказаў, што мокры певень заўжды пад навесам хаваецца.

Ды — паводле грэка — якая розніца, калі ёсць гаспадар — і ў «навеса», і ў пеўня, і ў каня, з якімі працей і жыццё пражыць, і «мора перайсці»?

## Парадокс

Дырэктар аднаго з маскоўскіх тэатраў расказваў некалі, як наймаў на працу шафёра, як усім «кандыдатам» гаварыў, што зарплата добрая, што працы будзе няшмат — два-тры выезды за дзень. Ды людзі ўсё роўна адмаўляліся.

Чарговы нарэшце пахадзіў па калідорах і агучыў прычыну: «А ў вас красці няма чаго...»

У рэстаране — было. Не столькі скрасці, як з'есці, чым Марына і карысталася. «Кінь ты, дужа не захапляйся, — папярэджвалі дзеўку жанчыны, — табе ж дрэнна будзе». — «А чаму гэта — ад добрага ды раптам дрэнна?» — смяялася тая.

...Цяпер ёй аднак не да смеху: распаўнела, баляць суставы і страўнік. Есці па-ранейшаму ўжо не можа.

І што крыўдна, не есці — таксама.

## Крок

Вечар, тэлевізар, інтэрв'ю — на гэты раз з вядомым акцёрам (дарэчы, з сынам яшчэ больш вядомай, нават вялікай актрысы). Ён успамінае сваё маленства, жыццё ў бабулі — без мамы. І з ёй — на розных гастролях...

Падчас адной яны пайшлі гуляць па беразе рэчкі, потым дарослыя ўзялі лодку — сталі катацца. Хлопчыка пакінулі, каб пільнаваў рэчы, а ён, засумаваўшы, адышоўся ў лес і знайшоў там россып суніц!

Наеўся сам, назбіраў для мамы і яе спадарожніка.

Яны таксама з радасцю частаваліся ды так нахвальвалі, што хлопчык вырашыў паказаць ім месца, дзе наспела столькі суніц. Яно было блізка — вакол невялічкай будынінкі, на якой красаваліся дзве літары «М» і Ж».

...Ад вялікага да смешнага — крок. Нават у вялікіх.

## Па цыбулю з усмешкай

Пасля школы дзядзька Янак уладкаваўся працаваць на Мінскі трактарны і адразу ж стаў Ванем, Іванам. Янкаў, казаў, там ужо не было — усе размаўлялі па-руску. «Я таксама стараўся, — згадваў былы навічок, — аж галава да вечара пухла».

Відаць, таму ён аднойчы плюнуў і стаў размаўляць па-свойму...

Дзед Міхась таксама — з усімі і заўсёды. Неяк, праўда, у краму прыйшоў.

— Узваж мне кілю *цыбулі,* — папрасіў прадавачку.

— Вам *лука?* — удакладніла дзяўчо.

Ну што тут будзеш рабіць?! Змірыўся, сказаў:

— Ну давай хоць *лука.*

## Асцярожна...

Здароўе не купіш, а вось кансультацый дактароў — абы грошы — хоць 20 штук. Вунь колькі медцэнтраў цяпер, колькі спецыялістаў... А ўжо хвалёных...

Той — давер выклікаў адразу ж: сталы, самавіты, прыязна сустрэў, спытаў, што прывяло.

Адказвала па-беларуску. Доктар — не сказаць, каб здзівіўся, не сказаць, каб не слухаў (але ж як бы ў паўвуха)... Ён жа не сказаць, каб не глядзеў і не тлумачыў... Але ж з нейкай асцярогай, нібы чакаючы дурнога ці што?

І толькі нарэшце, пачуўшы маё «дзякуй-бывайце» (то-бок перакanaўшыся, што падвоху не будзе), шчыра ўсміхнуўся, сказаў «калі ласка» і «ўсяго найлепшага»...

Мог бы і хацеў (на твары было напісана) нешта яшчэ — па-нашаму, па-беларуску, але...

Дзверы ўжо зачыніліся.

## На добрую памяць

...Што ў той раз было на стале? Напэўна, віно ці чай... Хто частаваўся, таксама ўжо не ў памяці, але ж дзверы ў пакой адчыніліся, і ў іх з'явілася светлая (бо сівая) галава калегі.

— Што святкуем? — папытаўся ён.

— Дзень нараджэння...

— О-о, віншую! — заўсміхаўся той і адразу ж знік, каб хвілін праз дзесяць з'явіцца — з шампанскім і маленькім падаруначкам — наборам для спецый...

Мы хораша тады пасядзелі — не першы раз і — добра — не апошні. Аднак помніцца іменна той. Нават ведаю чаму: калегі не стала гадоў з пяць таму, а вось падарунак яго па-ранейшаму стаіць на кухонным стале, не дае забыцца.

Праўду кажуць, што людзі не сыходзяць, яны застаюцца з намі — светлымі, такімі, якімі і былі.

## Каб ведалі...

Двое сяброў, выпадкова трапіўшы ў адно з тутэйшых мястэчак, вырашылі прайсці па вуліцах, паглядзець, а заадно і даведацца, што тут ёсць старыя яўрэйскія могілкі, ёсць польскія і ёсць рускія.

— А дзе ж беларусаў хаваюць? — спыталі ў нейкага дзядзькі.

Той, відаць, з гумарам быў: сказаў, што беларусы — не ўміраюць... Ці не жывуць.

Калі меркаваць па мове на помніках, дык яно і сапраўды.

Апроч таго, скупыя там звесткі: прозвішча, імя ды імя па бацьку, гады жыцця. Часам, праўда, — пранізлівыя радкі накшталт: *«Радость утрачена, горе — не меряно, самое главное в жизни утеряно».* (Хто там перажываў за няўдалую стрыжку, скрадзены ровар, малы аклад?) А часам...

На знаёмых могілках пахавана Эмілія Быстрымовіч, па-зверску замучаная немцамі 26 студзеня 1944 года на 46 годзе жыцця (звесткі з помніка). І яшчэ — жудасна ўявіць — брат і сястра Коля і Надзя Гардзеі, 17 і 18 гадоў, забітыя нелюдзямі з нашых 25 красавіка 1944.

Абедзве магілкі, на вялікі жаль, далёка ад увахода, ад асноўных сцежак-праходаў. Таму каля іх, відаць, рэдка спыняюцца людзі. А яно ж трэба было б... Можа, нават прыводзіць.

Каб ведалі. Каб помнілі.

**Валянціна ДОЎНАР.**




# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Пытанне — адказ

## ШТО ТАКОЕ КРЭМ-МЁД?

***Зараз на рынках можна сустрэць такі экзатычны прадукт, як крэм-мёд. Гэта новы тавар, пра які мала інфармацыі нават у інтэрнэце. Што гэта? У чым яго адрозненне ад звычайнага мёду? Што ў ім карыснага? І дзе набыць арыгінальны якасны прадукт?***

***Іван МЯЛЕШКА, г. Брэст.***



Адказвае **ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына БАЦЯН:**

— Крэм-мёд — гэта натуральны прадукт, які гатуюць шляхам узбівання зыходнага прадукту пчалаводства да аднароднай крэмавай кансістэнцыі. Такая тэхналогія была вынайдзена ў Канадзе, каб не ўжываць зацукраваны аселы мёд, які пачынае страчваць сваю карысць. У нас такі прадукт з'явіўся адносна нядаўна.

Тэхналогія яго вытворчасці простая: мёд узбіваецца да пачатку яго крышталізацыі. У выніку буйныя крышталі разбураюцца і структура атрымліваецца падобнай да смятаны. Прадукт насычаецца кіслародам, у яго павялічваецца аб'ём, кансістэнцыя робіцца крэмавай. Смак і водар могуць нязначна змяніцца, а колер пасвятлець да малочнага ці белага. Але калі гатаваць гэты прадукт правільна, выконваючы тэхналогію, то мёд сваіх карысных уласцівасцяў не страчвае.

У чым адрозненне ад мёду? Акрамя крэмавай кансістэнцыі і колеру — ні ў чым. Карысныя ўласцівасці і якасці крэму застаюцца тымі ж, што і ў зыходнага натуральнага прадукту. Яго асаблівасць у тым, што дзякуючы мяккай кансістэнцыі яго можна лёгка намазаць на хлеб ці есці лыжкай, у той час як звычайны мёд крышталізуецца і цвярдзее, за кошт чаго губляе свае карысныя ўласцівасці. Крэм-мёд захоўваецца доўга — каля года.

Як не трапіць на падробку? Гэта складанае пытанне, бо распазнаць яе амаль немагчыма. Тут дарэчы толькі адна парада: набывайце крэм-мёд у спецыялізаваных магазінах ці ў праверaных гандляроў.

## Палёт без турбот

**Набліжаецца сезон адпачынкаў, час, калі змучаны руцінай будняў арганізм расслабляецца і зараджаецца энергіяй. І паколькі адлегласць да месца адпачынку звычайна няблізкая, частка шляху праходзіць на борце самалёта на вышыні, большай за 10 000 метраў. Як зрабіць яе камфортнай, нам расказала ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена СТРАЕНКА.**



### Не забудзьце пра аптэчку

Падрыхтоўка да паездкі пачынаецца са збору чамадана. І тут пажадана скласці спіс загадзя.

— Перад паездкай сфарміруйце аптэчку першай дапамогі. Яна павінна ўключаць абязбольвальныя, гарачкапаніжальныя, антыгістамінныя сродкі, антыбіётыкі, прэпараты ад дыярэі, для ўжывання пры траўмах, ад укачвання, для загару, рэпеленты ад насякомых, сродкі першай дапамогі пры ўкусе пчол і змей, — кажа Алена Страенка. — Гэта сэканоміць час на пошук лекаў у незнаёмай краіне. Спіс варта скарэктаваць з улікам вашых асабістых хвароб.

### Правільнае адзенне і зручнае месца

Пры выбары месца ў салоне кіруйцеся сваім густам. Некаторыя любяць сядзець каля акна. Аднак падчас працяглага палёту кожны раз, калі спатрэбіцца выйсці, будзьце гатовы разбудзіць суседзяў побач. А тым, хто аддае перавагу месцам з краю, трэба быць гатовымі да пастаяннага руху з боку праходу. Але тут ёсць магчымасць устаць і прайсціся, акрамя таго, такія месцы дазваляюць сесці ў крэсле больш зручна.

Для палёту выбірайце зручнае адзенне з натуральных матэрыялаў. Падчас доўгіх пералётаў тэмпература ў салоне можа мяняцца, таму апранайцеся «слаямі»: майка, байка, вятроўка. Не забудзьцеся ўзяць цёплыя шкарпэткі, каб можна было зняць абутак і не адчуць холаду.

### Найлепшы напой — вада

Не трэба забываць, што палёт — стрэс для арганізма.

— За гэты час мы губляем да шклянкі вады ў гадзіну, кроў згушчаецца, павышаецца нагрузка на сасуды і сэрца. Але праносіць вадкасць у ручной паклажы забаронена, а кошт вады ў перадпалётнай зоне завышаны. Таму можна ўзяць з сабой пустую бутэльку для піцця, як у спартсменаў. Пасля зоны мытнага і пашпартнага нагляду заўсёды ёсць фантанчыкі для піцця, дзе можна набраць вады.

— Працэс абязводжвання ўзмацняецца прыёмам алкаголю, — звяртае ўвагу Алена Страенка. — Таму не трэба ў самалёце ўжываць віно ці гарэлку. Лепш адмовіцца і ад напояў, што змяшчаюць кафеін: яны перашкаджаюць сну і садзейнічаюць далейшаму абязводжванню.

Крэслы ў самалёце не самыя зручныя, ненатуральная поза і зніжаная актыўнасць выклікаюць ацёкі. Пакладзіце пад паясніцу падушку, згорнуты шалік ці світар, накрыйцеся пледам. Падушку і плед можна папрасіць у сцюардэсы. Не забывайцеся: чым вышэй ногі адносна падлогі, тым лепш, таму паспрабуйце паставіць іх проста на ўласны багаж пад крэслам перад вамі.

### Ледзянцы дапамогуць... вушам

У норме ціск у барабаннай поласці роўны атмасфернаму. Праблемы ўзнікаюць пры парушэнні гэтага балансу. Пры хуткім пад'ёме ўверх (узлёце самалёта) ціск у сярэднім вуху не паспявае выраўняцца і становіцца вышэйшы за атмасферны. Пры заходзе самалёта на пасадку ціск у сярэднім вуху перыядамі (да паступлення па слыхавой трубе чарговай порцыі паветра) аказваецца ніжэйшы за атмасферны. Гэта непрыемнае адчуванне, быццам бы вам у вуха трапіла вада і ніяк не выходзіць адтуль.

Каб аблегчыць праявы гэтага эфекту, дапамагаюць глытальныя і жавальныя рухі, на крайні выпадак «маляўнічы» зявок. Папулярнасцю карыстаюцца і ледзянцы, якія забяспечваюць глытальныя рухі падчас узлёту і пасадкі.

Калі пералёт доўгі, можна выкарыстоўваць бярушы ці навушнікі, маску для сну і падушку для падтрымкі шыі. Не забывайце, што навушнікі, якія выдаюць на борце, як правіла, не новыя, хоць і старанна ўпакаваныя. Іх ачышчаюць пасля палёту, а затым фасуюць зноў. З пункту погляду гігіены лепш узяць уласныя.

Выконваючы гэтыя няхітрыя правілы, вы забяспечыце сабе бесклапотны палёт.

## ОФІСНЫ БОЛЬ

### Як сядзячая работа павышае рызыку захворванняў

**Больш за 61 % беларусаў, якія займаюцца разумовай працай, маюць недастатковую фізічную актыўнасць. Да такіх высноў прыйшлі спецыялісты падчас даследаванняў. Гіпадынамія, у сваю чаргу, уплывае на ўсе сістэмы нашага арганізма, у прыватнасці, выклікае сардэчна-сасудзістыя захворванні, замаруджвае абмен рэчываў, спрыяе развіццю псіхічных расстройстваў.**

### НЕ СТРАЦІЦЬ ЗДАРОЎЕ Ў ОФІСЕ

**Вольга СІНЯКОВА, навуковы супрацоўнік клінічнай лабараторыі прафпаталогіі Навукова-практычнага цэнтра гігіены,** расказала, што даследаванне праводзілася ў адной з банкаўскіх устаноў Беларусі. Было абследавана 639 супрацоўнікаў, у якіх выяўлялі фактары рызыкі развіцця хранічных неінфекцыйных хвароб. Фізічная актыўнасць ацэньвалася па крытэрыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Згодна з імі нізкай яна лічыцца, калі чалавек прысвячае хадзьбе менш за 30 хвілін у дзень, умеранай, калі ходзіць не менш за 150 хвілін на тыдзень, і, адпаведна, высокай, калі займаецца бегам, аэробікай, яздой на веласіпедзе і інш. Сярод абследаваных 61 % мелі нізкую фізічную актыўнасць, і толькі 3 % — высокую.

У супрацоўнікаў банка таксама вызначалі баланс артэрыяльнага ціску на чатырох канечнасцях, праводзілі так званую аб'ёмную сфігмаграфію. У 77 % работнікаў разумовай працы гэта баланс парушаны. І адна з прычын дысбалансу — працяглае знаходжанне ў статычнай позе і малая фізічная актыўнасць. Акрамя таго, у 37 % выяўлены павышаны артэрыяльны ціск.

— Прычым многія не ведалі, што ім патрэбна фізічная актыўнасць. Чамусьці распаўсюджана меркаванне, што з высокім ціскам трэба ляжаць на канапе і чакаць, пакуль ён знізіцца ад прынятай таблеткі. Тым часам павышаны артэрыяльны ціск можна нармалізаваць з дапамогай правільна падабранай фізічнай актыўнасці, — падкрэсліла Вольга Сінякова.



Каля 33 % абследаваных мелі лішнюю вагу, 15 % пакутавалі на атлусценне I ступені, па 2,5 % — II і III ступені. І ў кожнага прасочвалася сувязь масы цела з узроўнем фізічнай актыўнасці.

**«Чамусьці распаўсюджана меркаванне, што з высокім ціскам трэба ляжаць на канапе і чакаць, пакуль ён знізіцца ад прынятай таблеткі».**

Недастатковая фізічная актыўнасць уплывае і на псіхічны стан, высветлілі даследчыкі. У чалавека зніжаецца псіхаэмацыянальны стан, адаптацыйныя магчымасці. Як адзначыла Вольга Сінякова, у арганізаваных працоўных калектывах, асабліва калі праца сядзячая, трэба вяртаць вытворчую гімнастыку. Але і кожнаму па сілах дадаць у сваё жыццё актыўнасці нават на працы:

— Пачынайце з малога, не трэба адразу ісці ў залу і цягаць штангу. Калі трэба аднесці паперы ў іншы кабінет, спусціцеся па лесвіцы, а не едзьце на ліфце. Калі трэба нешта абмеркаваць з калегам, не карыстайцеся тэлефонам, а прайдзіцеся да яго. Калі размаўляеце па тэлефоне, хадзіце па кабінеце ці хаця б стойце, а не працягвайце сядзець. Раніцай ці ўвечары праігнаруйце грамадскі транспарт і прайдзіцеся пару прыпынкаў пешшу, — раіць Вольга Сінякова.

### ПАЧЫНАЦЬ У ДЗЯЦІНСТВЕ...

Прыхільнасць да фізічнай актыўнасці трэба фарміраваць з дзяцінства. Прычым, калі любоў да спорту не дэманструюць на ўласным прыкладзе бацькі, чакаць яе ад дзяцей не трэба.

— Мы праводзілі даследаванне сярод дзяцей 3, 7, 10, 11-х класаў. Больш за трэць з іх сядзяць за камп'ютарамі і іншымі гаджэтамі больш за тры гадзіны ў дзень, — расказвае **загадчык лабараторыяй гігіены дзяцей і падлеткаў Навукова-практычнага цэнтра гігіены Наталля ГРЭКАВА.** — Каля 70 працэнтаў старшакласнікаў не выходзяць на прагулкі не таму, што шмат задаюць хатніх заданняў. А таму, што адразу пасля складаных урокаў садзяцца за складаную электронную прыладу. У іх не адпачываюць вочы, не адпачывае мозг ні на перапынку ў школе, ні дома.

### ...І НЕ СПЫНЯЦЦА Ў СТАРАСЦІ

— Многія лічаць, што, праходзячы 10 тысяч крокаў штодзень, яны робяць усё, каб жыць доўга. Але важна памятаць, што фізічная актыўнасць павінна быць інтэнсіўнай. Гэта 150 хвілін у тыдзень, калі ваш пульс павялічваецца на 40 працэнтаў, у адваротным выпадку не будзе выніку, — кажа **кіраўнік Рэспубліканскага геранталагічнага цэнтра, намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Але каля 20 працэнтаў дарослых не забяспечваюць сабе нават сярэднюю фізічную актыўнасць. Атлусценне, цукровы дыябет 2-га тыпу, артэрыяльная гіпертэнзія звязаны з гіпадынаміяй.

Эксперт падкрэсліла, што ў пажылым узросце людзі лічаць, што ім трэба зніжаць фізічную актыўнасць.

— Новыя даныя паказваюць, што гэта не так. Канешне, актыўнасць павінна быць не такая, як у маладых людзей, і для гэтага трэба параіцца з урачом. Напрыклад, у жанчын у постменапаўзе фізічная нагрузка дапамагае захаваць кальцый у касцях, — кажа Людміла Жылевіч. — У сябе ў цэнтры мы назіраем і тых, хто пражыў больш за 100 гадоў. Магу сказаць, што ўсе яны мелі пастаянную рухальную актыўнасць, але ні адзін не быў спартсменам высокага класа. Таму наша спадзяванне на даўгалецце павінна грунтавацца і на фізічных нагрузках.

**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Автотранспортного унитарного предприятия «Забудова-Автотранс»**

**Таблица № 1**

| № п/п Лота | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | № п/п Лота | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | седельный тягач MAZ 54323, 1999 года выпуска, светло-серого цвета, кузов (рама) Y3M543230X0026646, регистрационный номер OB6070 | 984,00 | 3 | легковой седан VAZ-2110 3, 2003 года выпуска, цвет темно-зеленый, кузов (рама) XTA21103030633631, регистрационный номер 7482OAC | 384,00 |
| 2 | седельный тягач MAZ 544008, 2007 года выпуска, бордового цвета, кузов (рама) Y3M54400870004870, регистрационный номер AB 6835-5 | 2 352,00 | | | |

*Лоты расположены по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4. В отношении Лотов №№1—3 проводятся седьмые повторные торги. Цена снижена на 80 %. Публикация об аукционе ранее размещалась 30.04.2019 в газете «Рэспубліка»)*

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **27 мая 2019 года в 13.00 (регистрация с 12.00 до 12.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1121 |
| Окончание приема заявлений | 24 мая 2019 года в 13.00 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной стоимости лота |
| Задаток | 10 % от начальной стоимости лота |
| Информация о продавце | Автотранспортное унитарное предприятие «Забудова-Автотранс» (Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, УНП 600468334). (ликвидатор – ООО «ФИБЛ») |
| Условия для участия в торгах | 1. Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah.<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту № __ , проводимых __.__.2019.<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Андрей, +375 29 304 25 60.<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>8. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона |

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: 8 (029) 348 92 25, e-mail: frondera@mail.ru**

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве будут проведены: **31 мая 2019 г. с 9.00 до 18.00** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY.

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53, +37529 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by

| Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|
| **Автомобиль «Фольксваген Венто», 1993 г. в., рег. знак. 3870 ЕР3** | 1 900,00 |
| Собственник (должник): Поляков Семен Владимирович, местонахождение лота – г. Гомель, ул. Головатского, 114 | |
| **Ножницы гильотинные НА 3421** | 12 500,00 |
| **Пресс листогибочный кривошипный** | 28 000,00 |
| **Пресс-ножницы Geka Bendikrop комбинированные** | 13 700,00 |
| **Станок токарно-винторезный** | 6 200,00 |
| **Станок фрезерный 6Р82Ш** | 23 200,00 |
| Собственник (должник): ООО «Юнигрупп» УНП 491319247, местонахождение лотов – г. Гомель, ул. Борисенко, 3В | |

Контактный телефон для ознакомления и осмотра **+37529 698-53-03.**

Для участия в торгах необходимо в срок по **30 мая 2019 г. до 16.00**: 1) перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY. Величина первого шага торгов составляет 5 % от начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов и оплатить лот не позднее семи рабочих дней со дня проведения торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY

**ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 04.06.2019 г. повторные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества СООО «ПОЛИФАС» (продавец)**

| Лот № | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сведения о предмете электронных торгов | Ангар с металлоконструкцией (цельнометаллический) | Ангар с металлоконструкцией (цельнометаллический) | Универсальная стеллажная система | Водоохлаждающая холодильная машина TAG561/CB26-16 | Доп. оборудование для производства трубок/жгута для экструзионной линии | Агломератор полимеров АПР-2 |
| Начальная цена предмета торгов, без НДС | 141 300,00 | 141 300,00 | 24 030,00 | 4 680,00 | 39 600,00 | 3 960,00 |
| Шаг аукциона 5 % | 7 065,00 | 7 065,00 | 1 201,50 | 234,00 | 1 980,00 | 198,00 |
| Сумма задатка 10 % | 14 130,00 | 14 130,00 | 2 403,00 | 468,00 | 3 960,00 | 396,00 |
| Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов | 100,00 | 100,00 | 70,00 | 60,00 | 80,00 | 50,00 |
| Местонахождение предмета торгов | 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 9 | | | | | |
| Р/с для перечисления суммы задатка | Расчетный счет для перечисления суммы задатка: р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793 | | | | | |

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 04.06.2019 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 04.06.2019 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел. (8-029) 6703084, на сайте WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец СООО «ПОЛИФАС», в лице управляющего по банкротству ООО «Агентство по антикризисному управлению» Павлович Андрей Георгиевич — (8-029) 6824317. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» — WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по 31.05.2019 г.

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1 января 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 6.1 | 304 430 | 334 122 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 6.2 | 175 | 622 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6.3 | 1 149 180 | 1 277 820 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6.5 | 3 845 080 | 2 646 076 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6.4 | 4 671 330 | 5 308 982 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 6.5 | 19 134 305 | 16 978 669 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | 4 | 113 397 | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 6.7 | 28 928 | 79 347 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6.8 | 439 463 | 493 201 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 6.9 | 39 203 | - |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 6.10 | 338 | 1 157 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 6.13.3 | 1 318 | 1 205 |
| 16 | Деловая репутация | | | - | - |
| 17 | Прочие активы | 1113 | 6.6 | 102 516 | 96 866 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | | 29 829 663 | 27 218 067 |
| 19 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | 6.11 | 789 997 | 343 233 |
| 21 | Средства банков | 1202 | 6.11 | 4 804 050 | 3 380 723 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | 6.11 | 18 351 715 | 17 349 541 |
| 23 | Ценные бумаги банка | 1204 | 6.11 | 1 712 685 | 2 243 038 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 6.13.3 | 1 459 | 1 300 |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | 6.11 | 146 596 | 177 383 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 25 806 502 | 23 495 218 |
| 28 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | 6.12 | 2 669 093 | 2 669 093 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | 6.12 | 369 132 | 290 625 |
| 32 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6.12 | 195 463 | 190 269 |
| 33 | Накопленная прибыль | 1215 | 6.12 | 789 473 | 572 862 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | | 4 023 161 | 3 722 849 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 4 023 161 | 3 722 849 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 29 829 663 | 27 218 067 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ

о прибылях и убытках

за 2018 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7.1 | 2 041 256 | 2 214 188 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7.1 | 777 852 | 977 545 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7.1 | 1 263 404 | 1 236 643 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7.2 | 426 530 | 374 576 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7.2 | 167 537 | 180 798 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7.2 | 258 993 | 193 778 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 7.5 | 297 | 369 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7.3 | 1 682 | 2 794 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7.3 | 165 209 | 141 983 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 7.5 | (3 142) | (121) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7.4 | 620 173 | 683 409 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7.5 | 114 400 | 55 100 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7.6 | 764 043 | 702 866 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7.6 | 57 892 | 55 917 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 358 735 | 188 354 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 48 085 | 34 149 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 310 650 | 154 205 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 11 955 | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 322 605 | 154 205 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 322 605 | 154 205 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 6.13.1 | 0,0120 | 0,0057 |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ об изменении собственного капитала за 2018 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | доля неконтролирующих акционеров | Всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | Раздел I. За год, предшествующий отчетному | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3011 | 2 669 093 | - | 249 115 | 534 452 | 193 700 | 3 646 360 | - | 3 646 360 |
| | В том числе: | | | | | | | | | |
| 1.1 | результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 41 510 | 38 410 | (3 431) | 76 489 | - | 76 489 |
| | В том числе: | | | | | | | | | |
| 2.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 154 205 | (2 437) | 151 768 | - | 151 768 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 41 510 | (41 510) | x | - | - | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | - | (75 278) | x | (75 278) | - | (75 278) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | - | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (75 278) | x | (75 278) | - | (75 278) |
| 2.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | - | - | - |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - | - | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 994 | (994) | - | - | - |
| 2.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (1) | - | (1) | - | (1) |
| 2.10 | приобретение дочернего юридического лица | | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2018 г. | 3013 | 2 669 093 | - | 290 625 | 572 862 | 190 269 | 3 722 849 | - | 3 722 849 |
| | Раздел II. За отчетный год | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2018 г. | 3011 | 2 669 093 | - | 290 625 | 572 862 | 190 269 | 3 722 849 | - | 3 722 849 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | | 78 507 | 216 611 | 5 194 | 300 312 | - | 300 312 |
| | В том числе: | | | | | | | | | |
| 5.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 322 605 | (4 425) | 318 180 | - | 318 180 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 77 530 | (77 530) | x | - | - | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (62 405) | x | (62 405) | - | (62 405) |
| 5.4 | **внесение в уставный фонд вкладов учредителей** (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | - | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (62 405) | x | (62 405) | - | (62 405) |
| 5.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | - | - | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - | - | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 3 086 | (3 086) | - | - | - |
| 5.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | 977 | 30 855 | 12 705 | 44 537 | - | 44 537 |
| 5.10 | приобретение дочернего юридического лица | | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2019 г. | 3013 | 2 669 093 | - | 369 132 | 789 473 | 195 463 | 4 023 161 | - | 4 023 161 |

## СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе

за 2018 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| №№ п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 6.12 | 322 605 | 154 205 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 8 | (4 425) | (2 437) |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, доходных вложений в материальные активы, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | (4 564) | (2 439) |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 139 | 2 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | 8 | 318 180 | 151 768 |
| 4 | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации | | | 318 180 | 151 768 |
| 5 | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о движении денежных средств

за 2018 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт Примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 2 061 710 | 2 235 896 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (817 279) | (966 616) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 422 836 | 374 380 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (166 163) | (179 874) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 297 | 369 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 2 028 | 2 771 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 131 240 | 118 181 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 918 111 | 311 838 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (1 214 145) | (658 685) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (47 502) | (12 456) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах — итого | 701 | | 1 291 133 | 1 225 804 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (5 086) | (51 687) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (1 235 534) | (260 677) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 799 425 | 2 069 984 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (2 105 240) | (1 456 899) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 573 | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (335 827) | 71 897 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (2 881 689) | 372 618 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 437 715 | (38 793) |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 1 279 100 | (858 420) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 276 044 | (106 955) |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | | (644 422) | 253 810 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (3 716) | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (8 179) | (738 751) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств — итого | 703 | | 1 336 542 | (1 489 109) |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (254 014) | 109 313 |
| 29 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (55 435) | (54 029) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 4 054 | 11 014 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | (18 646) | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (70 027) | (43 015) |
| 37 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (62 403) | (75 278) |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (62 403) | (75 278) |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 15 504 | 30 019 |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (370 940) | 21 039 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 9 | X | 2 521 696 |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 9 | 2 150 756 | X |

## Перечень участников банковского холдинга Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк») по состоянию на 1 января 2019 года

| №N п/п | Полное и сокращенное (в скобках) наименование юридического лица | Место нахождения | Фактическое место нахождения | Основной вид деятельности юридического лица | Основание оказания существенного влияния | Дата наступления основания оказания существенного влияния | Удельный вес голосов в процентах | Доля участия в уставном фонде в процентах | Информация о вхождении юридического лица в состав иной банковской группы, банковского холдинга |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Головная организация и участники банковского холдинга | | | | | | | | |
| 1.1 | Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк») | 220089, г. Минск, проспект Дзержинского, 18 | 220089, г. Минск, проспект Дзержинского, 18 | Деятельность коммерческих банков | - | - | - | - | - |
| 1.2 | Общество с ограниченной ответственностью «АСБ Лизинг» (ООО «АСБ Лизинг») | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 404 | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 404 | Финансовый лизинг | Основание 1 | 30.08.2013 | 100 | 100 | Нет |
| 1.3 | Унитарное предприятие «АСБ Санаторий Спутник» (Унитарное предприятие «АСБ Санаторий Спутник») | 222395, Минская область, Мядельский район, к.п. Нарочь, ул. Туристская, д. 14, комната 1 | 222395, Минская область, Мядельский район, к. п. Нарочь, ул. Туристская, д. 14, комната 1 | Деятельность санаторно-курортных учреждений | Основание 6 | 23.11.2004 | 100 | 100 | Нет |
| 1.4 | Унитарное предприятие «АСБ Санаторий Солнечный» (Унитарное предприятие «АСБ Санаторий Солнечный») | 225041, Брестская обл., Брестский р-н, Мухавецкий с/с, 46, здание профилактория 0,6 км западнее д. Гули | 225041, Брестская обл., Брестский р-н, Мухавецкий с/с, 46, здание профилактория 0,6 км западнее д. Гули | Деятельность санаторно-курортных учреждений | Основание 6 | 19.03.2007 | 100 | 100 | Нет |
| 1.5 | Унитарное предприятие по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» (Унитарное предприятие «АСБ БРОКЕР») | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 201 | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 502 | Посредническая (брокерская) деятельность по ценным бумагам | Основание 1 | 14.12.2012 | 100 | 100 | Нет |
| 1.6 | Общество с ограниченной ответственностью «АСБ Консалт» (ООО «АСБ Консалт») | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 704 | 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 704 | Аудиторская деятельность | Основание 1 | 27.05.2015 | 100 | 100 | Нет |
| 1.7 | Открытое акционерное общество «Банковский процессинговый центр» (ОАО «Банковский процессинговый центр») | 220116, г. Минск, пр. Дзержинского, дом 69, корп. 1, каб. 618 | 220116, г. Минск, пр. Дзержинского, дом 69, корп. 1, каб. 618 | Обработка данных | Основание 2 | 20.08.2002 | 49,28 | 49,28 | Нет |
| 1.8 | Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Единое расчетное и информационное пространство» (ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ЕРИП») | 220007, г. Минск, ул. Толстого, д. 6, 3-й этаж, ком. 303 | 220007, г. Минск, ул. Толстого, д. 6, 3-й этаж, ком. 303 | Денежное посредничество прочих финансовых организаций | Основание 2 | 26.01.2016 | 26,37 | 26,37 | Нет |
| 1.9 | Закрытое акционерное общество «Платежная система БЕЛКАРТ» (ЗАО «Платежная система БЕЛКАРТ») | 220004 г. Минск, пр. Победителей, 7А, (17 этаж, офис 55) | 220004, г. Минск, пр. Победителей, 7А (17-й этаж, офис 55) | Обработка данных, предоставление услуг по размещению информации и связанная с этим деятельность | Основание 2 | 01.10.2013 | 40,19 | 40,19 | Нет |
| 1.10 | Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп» (ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп») | 220007, г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8В | 220007, г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8В | Кассовые и инкассаторские услуги | Основание 2 | 30.03.2018 | 49 | 49 | Нет |

Председатель Правления В. М. Ананич
Главный бухгалтер И. П. Лысоковская

EY Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

Ernst & Young LLC
Klary Tsetkin St., 51A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 42 42
Fax: +375 (17) 240 42 41
www.ey.com/by

ООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. К. Цеткин, 51 А, 15-й этаж
Тел.: +375 (17) 240 42 42
Факс: +375 (17) 240 42 41

### Аудиторское заключение независимой Аудиторской организации ООО «Эрнст энд Янг» по годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «АСБ Беларусбанк», его дочерних организаций и зависимых юридических лиц как банковского холдинга, подготовленной по итогам деятельности за период с 1 января 2018 года по 31 декабря 2018 года

Г-ну Ананичу Виктору Михайловичу
Председателю Правления ОАО «АСБ Беларусбанк»

Акционерам, Наблюдательному совету, Аудиторскому комитету и Правлению ОАО «АСБ Беларусбанк»

Национальному банку Республики Беларусь

***Аудиторское мнение***

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее «консолидированная финансовая отчетность») Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее — ОАО «АСБ Беларусбанк» или «Банк»), его дочерних организаций и зависимых юридических лиц как банковского холдинга (далее — «Группа»), состоящей из консолидированного бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2019 года (Форма 1), консолидированного отчета о прибылях и убытках (Форма 2), консолидированного отчета об изменении собственного капитала (Форма 3), консолидированного отчета о движении денежных средств за 2018 год (Форма 4), примечаний к годовой консолидированной финансовой отчетности.

Указанная консолидированная финансовая отчетность была подготовлена руководством Группы в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года № 728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления бухгалтерской (финансовой) отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь, открытом акционерном обществе «Банк развития Республики Беларусь», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года № 15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе» и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки консолидированной финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее — «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

Согласно критериям, определенным постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов», консолидированная финансовая отчетность Группы на 1 января 2019 года включает финансовую информацию Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», его дочерних организаций Общества с ограниченной ответственностью «АСБ Лизинг», Унитарного предприятия «АСБ Санаторий Спутник», Унитарного предприятия «АСБ Санаторий Солнечный», Унитарного предприятия «АСБ БРОКЕР», Общества с ограниченной ответственностью «АСБ Консалт» и финансовую информацию зависимых юридических лиц Открытого акционерного общества «Банковский процессинговый центр», Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Единое расчетное и информационное пространство», Закрытого общества «Платежная система Белкарт», Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкассгрупп».

По нашему мнению, прилагаемая консолидированная финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Группы по состоянию на 1 января 2019 года, финансовые результаты деятельности Группы и изменения ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2018 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

***Основание для выражения аудиторского мнения***

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

***Ключевые вопросы аудита***

Ключевые вопросы аудита — это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита консолидированной финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита консолидированной финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах. В отношении указанного ниже вопроса наше описание того, как данный вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этому вопросу. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения консолидированной финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанного ниже вопроса, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой консолидированной финансовой отчетности.

***Ключевой вопрос аудита***

**Как соответствующий ключевой вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита**

**Специальные резервы на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам**

Оценка уровня специальных резервов на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам (далее — «специальные резервы») в соответствии с требованиями постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 28 сентября 2006 г. № 138 «Об утверждении Инструкции о порядке формирования и использования банками, открытым акционерным обществом «Банк развития Республики Беларусь» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» является ключевой областью суждения руководства Группы. При оценке кредитных рисков в значительной степени используются профессиональное суждение и допущения, а также производится анализ различных факторов, включая финансовое состояние заемщика, стоимость реализации объектов залога и прочие.

В силу существенности сумм кредитов клиентам, а также значительного использования суждений оценка специальных резервов представляет собой ключевой вопрос аудита.

Информация о специальных резервах на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам и подход руководства Группы к оценке и управлению кредитным риском описаны в Примечаниях 3, 6.5 и 10 к консолидированной финансовой отчетности Группы.

Наши аудиторские процедуры были выполнены в отношении процесса создания специальных резервов по кредитам юридическим и физическим лицам, включая изучение кредитных договоров, договоров обеспечения, анализ методологии создания специальных резервов, оценки финансового состояния заемщиков и выявления признаков негативной информации.

Наши аудиторские процедуры включали в себя пересчет резервов по индивидуально существенным кредитам, а также кредитам, имеющим повышенный кредитный риск. Мы провели анализ финансового состояния заемщиков, признаков негативной информации, наличия просроченной и пролонгированной задолженности, ожидаемых будущих денежных потоков, обеспеченности задолженности по кредитам, в том числе стоимости реализуемого залога на основании результатов независимой оценки, внутренней оценки Группы и нашего профессионального суждения. Мы проанализировали последовательность суждений руководства, применяемых при классификации задолженности по кредитам по группам риска.

Мы проанализировали информацию по специальным резервам на покрытие возможных убытков по кредитам клиентам, раскрытую в примечаниях к консолидированной финансовой отчетности Группы.

***Обязанности аудируемого лица по подготовке консолидированной финансовой отчетности***

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление консолидированной финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке консолидированной финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в консолидированной финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки консолидированной финансовой отчетности аудируемого лица.

***Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности***

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что консолидированная финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей консолидированной финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в консолидированной финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемомго лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательства делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в консолидированной финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление консолидированной финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях;
- получаем достаточные надлежащие аудиторские доказательства в отношении финансовой информации организаций и хозяйственной деятельности внутри Группы, чтобы выразить мнение о консолидированной финансовой отчетности. Мы отвечаем за общее руководство, контроль и проведение аудита Группы. Мы являемся единолично ответственными за наше аудиторское мнение.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Станкевич
Иван Вячеславович,
Заместитель генерального директора – Директор по аудиту

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002137 от 2 октября 2013 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 74 от 15 января 2014 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования — 29 декабря 2016 года).

Коршун
Александр Иванович
Заместитель начальника отдела аудита – аудитор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002271 от 3 апреля 2015 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, банковских группах и банковских холдингах № 105 от 11 января 2018 года, без ограничения срока действия.

***Сведения об аудируемом лице***

Наименование: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк».

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, регистрационный № 56.

Местонахождение: 220089, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18.

***Сведения об аудиторской организации***

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг».

Свидетельство о государственной регистрации № 190616051, выданное Минским городским исполнительным комитетом 15 декабря 2014 года.

Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 51А, 15-й этаж.

Подробности по тел. 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях ОАО «АСБ Беларусбанк»

НАВІГАТАР

На самай справе

# СКАЛЬПЫ І ТАМАГАЎКІ

## Самыя вядомыя памылкі пра індзейцаў

**У дзяцінстве мы захапляліся кніжкамі Майна Рыда і Джэймса Фенімора Купера, а таксама праглядамі шматлікіх вестэрнаў. Асноўнымі героямі гэтых твораў (разам з каўбоямі) былі індзейцы — асноўнае насельніцтва тады нядаўна адкрытай Амерыкі. Але як большасць людзей сабе іх уяўляе? Звычайна — гэта маўклівы чырванаскуры дзікун з лукам і тамагаўкам у руках і звязкам скальпаў на поясе. У рэчаіснасці карэнныя жыхары Амерыкі былі зусім не такімі, якімі іх паказваюць у галівудскіх фільмах.**



### Не скура, а фарба

З падачы першых амерыканскіх каланістаў індзейцаў сталі называць «чырванаскурымі». Але гэта зусім не азначае, што колер скуры абарыгенаў быў чырвоны, хоць бы таму, што падобнага пігменту ў прыродзе проста не існуе.

Справа ў тым, што індзейцы любілі фарбаваць твар і грудзі ў чырвоны колер. Для гэтага яны выкарыстоўвалі адмысловую фарбу з охры і тлушчу. Асабліва любілі падобны бодзі-арт ваяўнічыя плямёны апачаў. Размалёўка целаў служыла нейкай магічнай абаронай для воіна і паказвала яго статус. На самай справе колер скуры індзейцаў у залежнасці ад рэгіёнаў вар'іраваўся ад жоўта-карычневага да бронзавага.

### Скальпы не збіралі. Але прадавалі

Са скальпаваннем сярод паўночнаамерыканскіх індзейцаў звязана нямала памылак. Самай распаўсюджанай з'яўляецца тое, што індзейцы збіралі скальпы сваіх ворагаў.

Вядома, гэтыя выпадкі мелі месца, але ў цэлым гэта не было ўсеагульнай традыцыяй. Часта індзейцы здымалі скальпы толькі ў адказ на падобную абразу з боку ворага. Больш за тое, менавіта каланісты-еўрапейцы ўвялі звычай плаціць індзейцам за знятыя скальпы як грашыма, так і «вогненнай вадой». Яшчэ існуе памылковае меркаванне, што ўсе скальпаваныя людзі абавязкова гінулі. Вядома нямала выпадкаў, калі пасля гэтага жорсткага абраду людзі не толькі выжывалі, але і працягвалі весці нармальнае жыццё.

### Апошні з магікан

У гістарычным рамане вышэй згаданага Джэймса Фенімора Купера расказваецца драматычная гісторыя жыцця і смерці індзейца Ункаса — апошняга з племя магікан. Дзеянне рамана адбываецца ў сярэдзіне XVIII стагоддзя.

Даследчыкі высветлілі, што Ункас — чалавек, які рэальна існаваў, толькі жыў ён на 150 гадоў раней за падзеі, якія апісваюцца ў кнізе. На самай жа справе племя магікан не вымерла да гэтага часу і ў 2003 годзе налічвала 1611 жыхароў. У кнізе Купера дэлавары выступаюць у ролі станоўчых персанажаў, а іракезы — антаганістаў. Прычына гэтага да смешнага банальная: першыя былі саюзнікамі ЗША, а другія — Вялікабрытаніі.

### Тамагаўкі не кідалі

Тамагаўк — верная зброя індзейца. У фільмах і кнігах паказваюцца дзіўныя здольнасці абарыгенаў кідаць гэтыя сякеркі ў ворагаў з даволі немалой адлегласці.

У рэчаіснасці пра гэты «факт» не згадваецца ні ў адной пэўнай крыніцы, што, хутчэй за ўсё, сведчыць аб адсутнасці такой практыкі ў індзейцаў. Больш за тое, да дзяржання сякер звычайна прывязвалася пятля, якая надзявалася на руку. Гэта значыць, што воіны seклі тамагаўкамі і не жадалі, каб іх зброя кудысьці знікла. Ды і калі падумаць рацыянальна — які сэнс кідаць сваю асноўную зброю ў ворага і застацца пасля гэтага безабаронным? Хутчэй за ўсё, гэта не больш чым выдуманы кінаштамп, ад якога любая сцэна бітвы проста будзе выглядаць больш эфектнай.

### Добрыя — кепскія

Вобраз карэннага паўночнаамерыканскага народа моцна рамантызавалі мастацкая літаратура і кінематограф. Практычна заўсёды індзеец з'яўляецца высакародным дзікуном, які абараняў свае землі.

Насамрэч «чырванаскурыя» былі жорсткімі. Існавалі як мірныя плямёны, так і ваяўнічыя, апошнія не шкадавалі нікога. Яны забівалі мужчын і бралі ў палон дзяцей і жанчын, выразалі ўсю скаціну і спальвалі вігвамы і іншае жыллё. Войны сярод індзейцаў былі звычайнай з'явай. На Дзікім Захадзе дзейнічаў толькі адзін закон — хто мацнейшы, той і мае рацыю.

Даведнік

# ШТО ТАКОЕ ФЕНОМЕН МНОЖНАЙ НЕДАСВЕДЧАНАСЦІ

**Уявіце, што вы выказалі меркаванне, якое здавалася вам настолькі натуральным, настолькі само сабой зразумелым — вы былі ўпэўнены, што ніхто ў здаровым розуме яго не стаў бы аспрэчваць. А аказалася, што вы нават не ў меншасці — у поўнай адзіноце. З вамі калі-небудзь адбывалася нешта падобнае?**



Ці супрацьлеглая сітуацыя: вы з сябрамі паглядзелі ў кінатэатры нейкі фільм, які ніякіх пачуццяў, акрамя нуды і здзіўлення, у вас не выклікаў, але робіце выгляд, што падзяляеце захапленні ўсёй кампаніі. Ці седзіце ў рэстаране з сябрамі, заказалі бутэльку дарагога віна і абмяркоўваеце яго вытанчаны смак, які ў рэчаіснасці выклікае ў вас асацыяцыі з вадкасцю для мыцця шкла. І вы маглі быць не адзін з такімі сваімі думкамі — проста з вамі і вашымі сябрамі адыграў злы жарт феномен, вядомы ў псіхалогіі як «феномен множнай недасведчанасці».

Тэрмін «феномен множнай недасведчанасці» быў прапанаваны ў 1931 годзе псіхолагамі Даніэлем Кацам і Флойдам Олпартам. Пад гэтым тэрмінам маецца на ўвазе на здзіўленне распаўсюджаная сітуацыя, калі адзін член групы знаходзіцца ва ўпэўненасці, што меркаванне ўсіх астатніх проста процілеглае яго ўласнаму. Гэта свайго роду версія казкі пра голага караля, якая часта здараецца ў рэальным жыцці. Кац і Олпарт правялі серыю эксперыментаў з удзелам студэнтаў Сірак'юзскага ўніверсітэта. Аказалася, што гэты феномен можа з лёгкасцю прымусіць маладых людзей піць алкаголь у вялікай колькасці і пускацца ва ўсе цяжкія — дастаткова пераканаць іх, што так робяць УСЕ. Падобным чынам гэты феномен можа распаўсюджвацца на ўсё што хочаце — ад харчовых звычак і густаў у вопратцы да палітычных поглядаў.



# КАСМАНАЎТЫ БУДУЦЬ ВЫРОШЧВАЦЬ ВОДАРАСЦІ

**Падчас працяглых касмічных палётаў членам экіпажаў касмічных караблёў прыйдзецца самастойна вырошчваць ежу, таму што дастаўка з Зямлі будзе немагчымая.**

Пры гэтым ім будзе важна разнастаіць рацыён, паколькі харчавацца адной бульбай, як персанаж Мэта Дэймана ў фільме «Марсіянін», наўрад ці хтосьці захоча. Даследчыкі з Міжнароднай касмічнай станцыі пачалі эксперымент, падчас якога высвятляць, ці змогуць яны вырошчваць, есці водарасці і атрымліваць з іх кісларод. Здаецца, гэта цалкам магчыма.

Для вырошчвання багавіння яны будуць выкарыстоўваць фотабіярэактар, які нядаўна быў дастаўлены на станцыю грузавым караблём SpaceX Dragon. Лічыцца, што пры дапамозе яго касманаўты атрымаюць не толькі пажыўную біямасу, якая можа складці 30 % рацыёну ўдзельнікаў будучых касмічных місій, але і дадатковую крыніцу чыстага кіслароду. Для гэтых мэт, дарэчы, выдатна падыходзяць водарасці Chlorella vulgaris, якія і будуць вырошчвацца ўнутры біялагічнага рэактара.

Мяркуецца, што прылада будзе працаваць сумесна з фізіка-хімічнай сістэмай рэцыркуляцыі паветра і тэхналогіяй ACLS для перапрацоўкі вуглякіслага газу ў кісларод. У асноўным кісларод на МКС здабываецца шляхам электролізу вады, якую дастаўляюць на грузавых караблях, — вадарод, які ўтвараецца пры гэтым, пасля скідаецца ў касмічную прастору. Дзякуючы багавінню і іншым тэхналогіям стварэння кіслароду транспарт зможа дастаўляць на 400 літраў вады менш ці выкарыстоўваць гэты аб'ём у іншых мэтах.

Калі эксперымент пройдзе паспяхова і прылада дакажа сваю эфектыўнасць, тэхналогія будзе шырока ўжывацца пры пілатаваных даследаваннях Месяца і каланізацыі Марса. Падчас гэтых місій дастаўка прадуктаў з Зямлі будзе немагчымая, і справа не толькі ў вялікай адлегласці, але і ў павялічаным аб'ёме грузу. Менавіта таму даследчыкі так актыўна займаюцца стварэннем замкнёнай сістэмы жыццезабеспячэння, дзе дастаўка ежы і вады папросту не будзе патрэбна.

Характэрна, што ў грузавым караблі SpaceX Dragon таксама былі дастаўлены матэрыялы для запаволення акісляльных працэсаў у клетках касманаўтаў. Лічыцца, што калі-небудзь яны лягуць на аснову лекаў, якія ліквідуюць наступствы працяглага знаходжання ва ўмовах бязважкасці.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ПАЗБАВІЦЦА АД МАРКОЎНАЙ МУХІ БЕЗ ХІМІІ



**Маркоўная муха — маленькі, але злосны шкоднік морквы, пастарнака, сельдэрэя і пятрушкі. За адзін дачны сезон нашы градкі з морквай атакуюць два пакаленні гэтага шкоднага насякомага. Яе даўжыня — усяго 4-5 міліметраў. У яе чорнае брушка, чырвоная галава і жоўтыя лапкі. Яна лётае з дапамогай шырокіх празрыстых зеленаватых крылаў.**

Кукалкі маркоўнай мухі выдатна зімуюць як у склепе побач з морквай, так і ў верхнім пласце глебы на ўчастку. Яны выдатна пераносяць любыя маразы, практычна не вымярзаюць. У маі, калі пачынаюць цвісці яблыні і рабіны, а глеба праграваецца да 15 °С, можна чакаць першы вясновы лёт маркоўнай мухі. На працягу наступных 20-25 дзён яна будзе адкладаць яйкі ўнізе сцёблаў маленькіх раслін морквы. Праз 5-10 сутак з яек з'яўляюцца лічынкі і пачынаюць угрызацца ў караняплод.

На моркве, пашкоджанай маркоўнай мухай, застаюцца чорныя «хады» і чарвяточыны, якія цяжка не заўважыць. Бацвінне пашкоджанай морквы можа стаць цёмна-фіялетавым, жоўтым або пачаць сохнуць. Да ліпеня лічынкі «за абедзве шчакі» трэскаюць нашу моркву, а затым акукляюцца і ператвараюцца ў другое пакаленне мух, якія зноў пачынаюць размнажацца. Летні вылет маркоўнай мухі прыпадае на сярэдзіну ліпеня — сярэдзіну жніўня. Цяпер дзеткі другога пакалення будуць ласавацца саспелай морквай, а потым застануцца зімаваць на градках і ў сховішчах.

Як і ва ўсіх, у маркоўнай мухі ёсць свае слабасці. Варта згуляць на іх — і можна будзе забыцца пра гэтага шкодніка назаўжды. Па-першае, маркоўная муха не любіць паху цыбулі. Таму той, хто вырошчвае цыбулю з морквай у змешаных пасадках, звычайна ад маркоўнай мухі не пакутуе. Як, зрэшты, і ад цыбульнай. Па-другое, маркоўнай мусе не падабаюцца выдзяленні каранёў аксамітак і нагаткоў. Так што зусім не лішнім будзе ўпрыгожыць міжраддзі маркоўнай грады гэтымі выдатнымі кветкамі. І прыгожа, і муха не лётае! Нарэшце, маркоўная муха аддае перавагу вільготнасці і ценю. А значыць, чым радзейшыя пасадкі, тым лепш. Чым радзейшы паліў, тым лепш. Больш эфектыўна паліваць моркву раз на тыдзень, але багата, на вялікую глыбіню, чым кожны дзень размахваць палівачкай над градкамі.

Акрамя гэтага існуе шмат народных сродкаў супраць маркоўнай мухі.

1. Біяпрэпараты. Найменш працаёмкі (але даволі выдаткоўны) метад прадугледжвае выкарыстанне біяпрэпаратаў ад шкоднікаў. Падчас лёту мухі, гэта значыць у маі і ліпені, апырскваюць градкі з морквай адмысловым біяпрэпаратам. Для людзей і жывёл ён бясшкодны, а вось шкодніка да пасадак не падпусціць.

2. Нашатырны спірт. Вясной і ў пачатку лета маркоўныя градкі можна паліць растворам нашатырнага спірту: 1-2 сталовыя лыжкі на 10 літраў вады. Аміяк і маркоўную муху пахам напалохае, і ў якасці азотнай падкормкі спрацуе.

3. Соль. У пачатку чэрвеня два разы з інтэрвалам у 10 дзён маркоўныя градкі праліваюць растворам паваранай солі: 1 сталовая лыжка на 10 літраў вады.

4. Шалупіна цыбулі. Як толькі ўсходы морквы ўтвараюць 2-3 сапраўдныя лісточкі (або падчас першага прарэджвання), бяруць 400 грамаў цыбульнай шалупіны, заліваюць пяццю літрамі гарачай вады, настойваюць двое сутак, затым працэджваюць і апырскваюць пасевы. Шалупіну цыбулі не выкідваюць, а раскладваюць у міжраддзях. Акрамя цыбульнай шалупіны для настою можна выкарыстоўваць крываўнік, памідорнае бацвінне або палын.

5. Нафталін. У маленькіх пластыкавых бутэльках робяць некалькі вялікіх адтулін. У бутэльку змяшчаюць таблетку нафталіну і закрываюць корак. Затым бутэлькі раскладваюць па пасадках морквы. На сонейку нафталін награваецца і выдае непрыемны для маркоўнай мухі пах.

6. Апельсінавыя скарынкі. Для таго каб збіць муху з панталыку нязвыклым пахам, моркву пры прарэджванні апырскваюць настоем апельсінавых скарынак: 1 кілаграм сухіх скарынак трэба заліць 10 літрамі цёплай вады і настойваць трое сутак у цёмным месцы.

Многія на час лёту маркоўнай мухі абсыпаюць міжраддзі тытунёвым пылам, гарчычным парашком, чорным ці чырвоным молатым перцам. Камусьці гэта выдатна дапамагае, камусьці — не.

У заключэнне хацелася б яшчэ раз звярнуць увагу на тое, што ні адно апырскванне або паліў не эфектыўна так, як захаванне севазвароту і змешаныя пасадкі. Гэтыя простыя і дзейсныя прыёмы ўжо даўно з поспехам ужываюць па ўсім свеце.

Даты | Падзеі | Людзі

**15 МАЯ**

У краіне

**1845** год — дзень нарадзіўся (маёнтак Сволна Дрысенскага павета Віленскай губерні) Іван Дзяменцьевіч Чэрскі, вядомы геолаг, палеантолаг і географ, даследчык Сібіры. Географы ўсіх краін свету, чытаючы лекцыі аб Усходняй Сібіры, сцвярджаюць: у Байкале бярэ пачатак толькі адна рака — Ангара, упадаюць жа ў возера 333 малыя і вялікія ракі. Але мала каму вядома, што гэты падлік зрабіў наш зямляк, ураджэнец сённяшняга Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў Іван Чэрскі быў выключаны з інстытута, аддадзены ў салдаты і сасланы ў Сібір. У 1885 годзе быў амніставаны і па запрашэнні Пецярбургскай АН пераехаў у Пецярбург. У 1891-м узначаліў экспедыцыю ў недаследаваны раён рэк Калыма і Індыгірка. Памёр у 1892 годзе ў час гэтай экспедыцыі. Пахаваны на беразе Калымы ва ўрочышчы Амалон. За заслугі ў галіне палеанталогіі ўзнагароджаны трыма залатымі медалямі Рускага геаграфічнага таварыства. Яго імем былі названы сістэма горных хрыбтоў у Паўночна-Усходняй Сібіры, хрыбет у Забайкаллі і інш. На радзіме вучонага створаны музей Чэрскага. Яго імем названая вуліца ў Верхнядзвінску.



**1914** год — нарадзіўся Мікалай Васілевіч Гурло, беларускі мастак-графік. Працаваў у жанры плаката, станковай, сатырычнай і кніжнай графікі. Аўтар шматлікіх сатырычных малюнкаў для выдання «Раздавім фашысцкую гадзіну!», гумарыстычных і сатырычных малюнкаў для часопісаў «Вожык», «Полымя», «Работніца і сялянка», «Беларусь». Аформіў кнігі «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі, «На вясёлай вайне» Э. Валасевіча і іншыя. Памёр у 1980 годзе.

**1924** год — нарадзіўся (г. Мінск) Уладзімір Іванавіч Ярмак, Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1942 года на Ленінградскім фронце, радавы. 19 ліпеня 1943-га ў час разведкі боем у раёне Сінявінскіх вышынь (пад Ленінградам) закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота, чым забяспечыў групе разведчыкаў выкананне баявога задання.

**1979** год — у Мінску пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі адкрыты Музей старажытнабеларускай культуры. У аснову музейнага збору былі пакладзены калекцыі, сабраныя за многія гады супрацоўнікамі Інстытута падчас мастацтвазнаўчых і этнаграфічных экспедыцый па ўсёй Беларусі.

У свеце

*Міжнародны дзень сем'яў. Адзначаецца штогод, пачынаючы з 1994 года, у адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 20 верасня 1993 года.*

**1859** год — нарадзіўся П'ер Кюры, французскі вучоны-фізік, адзін са стваральнікаў вучэння пра радыеактыўнасць, лаўрэат Нобелеўскай прэміі (1903). Адкрыў і даследаваў п'езаэлектрычнасць. Разам з жонкай Марыяй Складоўскай-Кюры адкрыў палоній і радый, даследаваў радыеактыўнае выпрамяненне. Увёў тэрмін «радыеактыўнасць». Памёр у 1906 годзе.

**1925** год — нарадзілася Людміла Іванаўна Касаткіна, савецкая актрыса тэатра і кіно, народная артыстка СССР. З 1947 года актрыса Цэнтральнага акадэмічнага тэатра Расійскай Арміі. Стварыла больш за 60 рознахарактарных вобразаў. Знялася ў кіна- і тэлестужках «Выклікаю агонь на сябе», «Помні імя сваё», «Маці Марыя».

**1932** год — дэкрэтам Савета Народных Камісараў СССР за подпісам Сталіна была аб'яўлена так званая бязбожная пяцігодка, якая паставіла мэту «на 1 мая 1937 года ліквідаваць усе культавыя збудаванні і «выкараніць» бога на тэрыторыі краіны».

**1955** год — у венскім палацы Бельведэр паўнамоцнымі прадстаўнікамі краін — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі быў падпісаны дагавор аб аднаўленні незалежнай і дэмакратычнай Аўстрыі.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.08 | 21.05 | 15.57 |
| Віцебск — | 4.51 | 21.01 | 16.10 |
| Магілёў — | 4.58 | 20.55 | 15.57 |
| Гомель — | 5.01 | 20.45 | 15.44 |
| Гродна — | 5.24 | 21.19 | 15.55 |
| Брэст — | 5.32 | 21.13 | 15.41 |

### Месяц

*Першая квадра 12 мая.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

**Пр.** *Зоі, Апанаса, Барыса, Глеба, Давыда, Рамана.*
**К.** *Надзеі, Соф'і, Ізыдара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Сціпласць, якая ўпрыгожвае чалавека, называецца біжутэрыяй.**

— Фіма, у вас пад Адэсай ёсць дача. Што ты там звычайна саджаеш?
— Такі печань.

**Сучасным дзецям ніколі не спазнаць гэты боль...**
**У наш час мы глядзелі матч Англія — Нігерыя па чорна-белым тэлевізары.**
**Калі ты дадаваў яркасць, знікала зборная Англіі.**
**Калі ты памяншаў яркасць, знікала зборная Нігерыі.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1599.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2019 года.